Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЖНІЎНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 146 (30026)

НОВАЯ ЖАМЧУЖЫНА СТАЛІЦЫ 9

ЯК ТАНЦУЮЦЬ І КРЭАТЫВЯЦЬ У СПОРАВЕ 12

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Беларусь ужо другі год знаходзіцца пад беспрэцэдэнтным знешнім ціскам. У цэлым нам удалося паспяхова пераадолець першы, самы складаны, этап — адаптацыю эканомікі да новай рэальнасці. Своечасова прынятыя ўрадам меры дазволілі пазбегнуць летась развіцця падзей па негатыўным сцэнарыі. Прадпрыемствы працягвалі працаваць, нашы людзі былі абароненыя ад санкцыйнага ўдару, дзяржава ў поўнай меры выконвала свае сацыяльныя абавязацельствы. У 2023-м стаіць задача ў гэтых умовах перайсці ад этапу адаптацыі і аднаўлення эканомікі да росту. Вынікі работы эканомікі ў першым паўгоддзі — паказчык таго, наколькі эфектыўна атрымліваецца яе вырашаць і дзе ёсць рэзервы для развіцця».

Паўтысячы гадоў працоўнай біяграфіі

Фота БелТА.

Дынастыя Пархуціх — Гуравых — Ігнацюк — Дзмітрук усяго ўжо каля 500 гадоў працуе ў сельскай гаспадарцы. Амаль усе члены дынастыі аграрыяў — жыхары аграгарадка Хідры ў Кобрынскім раёне. Заснавальнікам дынастыі лічаць Сяргея Пархуціка, які нарадзіўся ў Хідрах у 1913-м. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ў 1949 годзе дапамагаў арганізоўваць у роднай вёсцы калгас, пазней шмат гадоў працаваў брыгадзірам. Многія прадстаўнікі дынастыі працавалі або працягваюць работу ў СВК «Узыходзячая зара».

КАРОТКА

- **Рамонт сталічных кацельняў да ацяпляльнага сезона праведзены больш як на 90 працэнтаў ад плана.**
- ДПК: за тыдзень больш за 11 тысяч замежнікаў наведала Беларусь без віз.
- **Другі энергаблок БелАЭС выпрацаваў першы мільярд кілават-гадзін электраэнергіі.**
- Экспарт піламатэрыялаў па біржавых адрасных здзелках перавысіў 63 тысячы кубаметраў.



Сельская гаспадарка

Фермы новага пакалення даюць «жывое» малако, а камбікорм з нанажалезам — добрае прыбаўленне вагі

Новыя навуковыя распрацоўкі заўсёды павінны правярацца на практыцы, асабліва калі яны ствараюцца ў галіне сельскай гаспадаркі. У нашай краіне даследчыя работы па розных напрамках дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм заўсёды звязаныя з рашэннем перспектыўных задач аграпрамысловага комплексу краіны. Работы праводзяцца ў цесным узаемадзеянні з племяннымі, сельскагаспадарчымі і навучальнымі арганізацыямі Мінсельгасхарча, а таксама іншых міністэрстваў краіны.

СТАР. 2

Па сутнасці справы

З ГЛЫБІНКІ З АПТЫМІЗМАМ

Летам так хочацца з'ехаць падалей ад асфальту, гулу аўтамабіляў і гарадскіх шматпавярховікаў! Каб адчуць водар скошанай травы, сарваць з куста нагрэты сонцам агрэст, заўважыць ноччу зоры ў небе...

Цяпер усё больш людзей настолькі цэніць перавагі невялікіх населеных пунктаў, што ў горад не вяртаецца. Але яснымі зорамі і чыстым паветрам сыты не будзеш. Як жывецца тым, хто абраў для сябе вёску або гарадскі пасёлак? Як яны гадуюць дзяцей? Чым зарабляюць? Пра што мараць?

СТАР. 4–5

ISSN 1990 — 763X

Ураджай на вышэйшым кантролі

На гэтым тыдні Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка асабіста пракантралюе ход жніва ў заходніх рэгіёнах краіны

А дагэтуль у нядзелю кіраўнік дзяржавы ацаніў уборку ўраджаю ў Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях з вышыні, праляцеўшы над рэгіёнамі на верталёце.

Сваю зацікаўленасць уборачнай кампаніяй на захадзе краіны Прэзідэнт агучыў у мінулы чацвер, прымаючы з дакладам віцэ-прэм'ера Леаніда Зайца. Ён паабяцаў, што наступны тыдзень будзе прысвечаны сельскай гаспадарцы, прычым менавіта ў заходніх рэгіёнах.

«У хуткім часе я пастараюся пабыць (у рэгіёнах. — **Заўв. БелТА**). У мяне ў плане захад паглядзець. Якраз зона тваёй адказнасці — Гродзенская вобласць. Паглядзім, магчыма, Брэсцкую вобласць. Цэлы комплекс работ Міністэрства сельскай гаспадаркі», — сказаў Прэзідэнт.

Карэспандэнт «Звязды» таксама будзе з кіраўніком дзяржавы ў яго рабочай паездцы. Сачыце за найбліжэйшымі нумарамі — мы ўсё падрабязна раскажам.

Блізкая ўлада

«УСЕ РАШЭННІ БУДУЦЬ ПРЫМАЦЦА ДЛЯ ТАГО, КАБ ПРАДПРЫЕМСТВА ПРАЦАВАЛА І РАЗВІВАЛАСЯ»

Старшыня Савета Рэспублікі сустрэлася з калектывам Мінскага домабудаўнічага камбіната

Учора Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася з працоўным калектывам ААТ «Мінскі домабудаўнічы камбінат». Яна паразмаўляла з работнікамі і адказала на хвалюючыя для іх пытанні, наведала вытворчыя цэхі і абмеркавала з кіраўніцтвам прадпрыемства далейшую стратэгію развіцця будаўнічай кампаніі.

Наталля Качанава адзначыла, што будаўнічая галіна для яе не новая, яна курыравала дадзеную сферу падчас сваёй работы намеснікам, а затым старшынёй Наваполацкага гарвыканкама. А значыць, добра ведае спецыфіку работы і пытанні, якія хвалююць калектыў, ёй знаёмыя. Таксама спікер Савета Рэспублікі падкрэсліла: для яе не сакрэт, што калектыў падтрымлівае кіраўніка свайго прадпрыемства, які прыкладае шмат намаганняў, каб будаўнічая кампанія працавала эфектыўна, і вынікі гэтай работы відаць.

— У вас амаль 600 працуючых, і ў межах горада нам важна, каб прадпрыемства працавала эфектыўна з улікам таго, што варта будаваць жыллё, іншыя аб'екты, выконваць даведзеныя задачы.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што ўсе рашэнні, якія прымаюцца ў дзяржаве, накіраваныя на людзей. Але рэалізоўваюцца яны парознаму — у залежнасці ад мясцовага кіраўніцтва і людзей, якія працуюць на тым ці іншым прадпрыемстве, установе ці арганізацыі. Што датычыцца Мінскага домабудаўнічага камбіната, то яго неабходна захаваць.

— Усе рашэнні будуць прымацца для таго, каб прадпрыемства працавала і развівалася, а не для таго, каб яго загубіць. У мяне ёсць прыклады, калі добрыя будаўнічыя трэсты ў свой час расфарміравалі, а сёння, калі трэба будаваць, тое некаму рабіць. І вымушаныя плаціць камандзіровачныя, каб туды прыязджалі людзі і будавалі жыллё і сацыяльныя аб'екты, — адзначыла Наталля Качанава. — Я вельмі перажываю за будаўнічую галіну, шмат размаўляла пра гэта з міністрам архітэктуры і будаўніцтва. Гэта ж няпростая работа, і калі мы не захаваем калектывы і прадпрыемствы, у нас няма будучыні. Сёння без будаўнікоў не абыдзецца ніхто і нідзе.

Спікер Савета Рэспублікі нагадала, што і Прэзідэнт краіны прыняў шмат рашэнняў, каб падтрымаць прадпрыемствы будаўнічай галіны.

— Быў час, калі мы мадэрнізавалі домабудаўнічыя камбінаты, каб яны маглі выпускаць панэлі новых серый, у прыватнасці, з меншай цеплаправоднасцю. Тыя сродкі, якія былі ўкладзены ў мадэрнізацыю, вядома, паўплывалі на эканоміку прадпрыемстваў. І Прэзідэнт прымаў рашэнні па падтрымцы такіх прадпрыемстваў у Віцебску, Салігорску, іншых гарадах. Калі сёння вы маеце патрэбу ў падтрымцы, то тое, чым мусіць дапамагчы вам горад — аб'ёмы, штосьсьці яшчэ, — варта зрабіць, — сказала Наталля Качанава.

Яна акцэнтавала ўвагу на тым, што сёння асноўнае пытанне для маладых сем'яў — патрэба ва ўласным жыллі. І цяпер выконваецца задача, пастаўленая Прэзідэнтам: на працягу года запрасіць шматдзетную сям'ю на будаўніцтва жылля — ці ў шматпавярховы дом, ці выдзеліць зямельны ўчастак пад будаўніцтва.

— Нам важна, каб задачы, якія перад намі стаяць, вырашаліся эфектыўна і на карысць людзей, як гэтага патрабуе ад нас Прэзідэнт. І шчыра кажучы, каб мы рабілі ўсё так, як кажа нам Прэзідэнт, праблем было б менш, бо ўсе рашэнні, якія ён агучвае, абсалютна правільныя, накіраваныя на карысць дзяржавы і дабрабыт народа, — адзначыла Наталля Качанава.

Падчас наведвання вытворчых цэхаў Старшыні Савета Рэспублікі прадэманстравалі прадукцыю прадпрыемства. А яна, дарэчы, унікальная, бо не выпускаецца больш ніводным домабудаўнічым камбінатам краіны.

— Прадпрыемства выпускае не асобныя панэлі, а практычна цалкам пакой, гатовы да мантажу. Адпаведна, гэта хуткія тэмпы будаўніцтва такога дома і канкурэнтаздольная цана. І тут варта зрабіць усё, каб у прадпрыемства былі аб'ёмы. Пакуль мы бачым, што ёсць пэўныя эканамічныя праблемы, але горад мусіць падтрымаць Мінскі домабудаўнічы камбінат, тым больш у кіраўніцтва ёсць бачанне, як вырашаць праблемы, каб выйсці на стабільную рэнтабельную работу. Я супрацоўнічаю з кіраўніцтвам Мінгарвыканкама, і мяркую, што будуць знойдзены тыя рашэнні, якія пойдуць на карысць і горада, і гэтага прадпрыемства, — рэзюмавала Наталля Качанава.

Алена КРАВЕЦ.

Аб чым яшчэ Наталля Качанава размаўляла з калектывам камбіната — у наступным нумары «Звязды», у дадатку «Мясцовае самакіраванне».

Фермы новага пакалення даюць «жывое» малако...

ПРЫ ДАЕННІ ПА РАСКЛАДЗЕ І МАЛАКО СМАЧНЕЙШАЕ

Аб найбольш важкіх распрацоўках і перспектыўных праектах у сферы жывёлагадоўлі распавёў **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па жывёлагадоўлі» Аляксандр БУДЗЕВІЧ.** Прадстаўнік навукова-практычнага цэнтра расказаў аб распрацаваных канцэптуальных тэхналагічных модульных рашэннях па стварэнні малочных фермаў новага пакалення. У іх выкарыстоўваецца алгарытм кіравання вытворчым працэсам на аснове інтэлектуальных лічбавых тэхналогій.

«Рэалізацыя канцэпцыі тэхналагічнай вытворчасці малака заснаваная на інтэлектуальных сістэмах кіравання вытворчасцю, прымяненні рабатызаваных сродкаў выканання асноўных вытворчых аперацый, якія базіруюцца на сістэмах маніторынгу. Каровы даюць больш малака не проста так, а таму, што іх фізіялагічны стан стаў лепшы ў сувязі з правядзеннем усіх элементаў вытворчасці па прынцыпе «дакладна своечасова». Кармленне і даенне жывёл строга па графіку, як аказалася, дае істотны станоўчы ўплыў на рэалізацыю патэнцыялу прадукцыйных жывёл. Таксама павышаюцца тэрміны гаспадарчага выкарыстання кароў і будзе забяспечана атрыманне малака высокай якасці пры значным зніжэнні ўдзельных выдаткаў на вытворчасць прадукцыі», — падсумаваў Аляксандр Будзевіч.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ВАДА З НАНАСЕЛЕНАМ

Нанатэхналогіі працягваюць актыўна развівацца ў розных галінах, у прыватнасці ў аграпрамысловым комплексе. Гэтыя тэхналогіі закранаюць усе галіновыя кірункі — раслінаводства, ветэрынарыю, перапрацоўку і жывёлагадоўлю. «Былі распрацаваны рэцэпты і лабараторныя ўзоры камбікармоў-канцэнтратаў для маладняку буйной рагатай жывёлы. Таксама мы распрацавалі паўнавартасныя камбікармы для свіней з уводам у пітную ваду нанаселену, нанажалеза і нанацынку, распрацаваных Інстытутам фізіка-арганічнай хіміі НАН Беларусі. Таксікалагічнай ацэнкай устаноўлена бяскшкоднасць і нетаксічнасць дадзеных камбікармоў для лабараторных жывёл. Папярэднія вынікі сведчаць аб павышэнні сярэднясутачнага прыросту масы і зніжэнні сабекошту атрыманай прадукцыі», — растлумачыў спецыяліст.

Таксама ён звярнуў увагу на распрацаваны і адкарэкціраваны праект тэхналагічнай схемы нанясення плёначнага пакрыцця на часцінкі прэпаратаў незаменных амінакіслот, у прыватнасці лізіну. Быў вывучаны ўплыў камбікармоў з уключэннем гэтых прэпаратаў на ступень выкарыстання азоту ў арганізме свіней і цялят.

«Устаноўлена, што прэпарат па сваім біялагічным дзеянні не аказвае адмоўнага ўплыву на арганізм свіней з уключэннем у склад камбікармоў. Акрамя таго, паказана прадукцыйнае дзеянне дадзеных камбікармоў на павышэнне тэмпаў росту маладняку і атрыманне свіней больш цяжкіх вагавых катэгорый. Таксама ўключэнне прэпарата ў камбікорм спрыяе павелічэнню атрымання абсалютнага сярэднясутачнага прыросту за перыяд даследавання», — падзяліўся вынікамі намеснік генеральнага дырэктара.

Паводле яго слоў, з мэтай павышэння прадукцыйнасці малочнай жывёлы праведзены даследаванні па рэгуляцыі складу мікрабіёма рубца з выкарыстаннем доследных партый камбікармоў, якія змяшчаюць прабіятычныя кармавыя дабаўкі на аснове кіслых і спараўтваральных бактэрый. Іх прымяненне павышае надой, а таксама дае дадатковы прыбытак.

«Распрацаваны саставы камбікармоў з выкарыстаннем макухі лёну алейнага і лёну-даўгунцу для цялят малочнага і паслямалочнага перыяду. Устаноўлены станоўчы ўплыў камбікармоў з розным узроўнем уводу макухі на фізіялагічны стан паддоследных цялят, вызначана заатэхнічная і эканамічная эфектыўнасць вырошчвання жывёл», — дадаў Аляксандр Будзевіч.

КАНЦЭПЦЫІ ДАКЛАДНАГА ЗЕМЛЯРОБСТВА

Пра тое, якую сельскагаспадарчую тэхніку распрацоўваюць беларускія навукоўцы, распавёў **генеральны дырэктар РУП «НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі» Дзмітрый КОМЛАЧ.**

Ён адзначыў, што забеспячэнне насельніцтва нашай краіны якаснымі эканамічна даступнымі прадуктамі харчавання і нарошчванне экспартнага патэнцыялу з'яўляюцца асноўнымі задачамі аграрнай галіны. Рашэнне гэтых задач шмат у чым залежыць ад тэхніка-тэхналагічнага ўзроўню вытворчасці, эфектыўнага прымянення сучасных сродкаў механізацыі, укаранення новых метадаў і прыёмаў выканання сельгасработ.

На думку Дзмітрыя Комлача, асноўны ўпор у развіцці сельгасвытворчасці павінен быць зроблены на больш эфектыўнае выкарыстанне інавацыйных распрацовак, пераход да канцэпцыі дакладнага земляробства і жывёлагадоўлі, што дазволіць атрымліваць прадукцыйнасць сартоў і парод жывёлы, блізкую да іх біялагічнага патэнцыялу.

Можна прывесці некалькі прыкладаў. Пасля ўборачнай кампаніі праводзіцца лушчэнне ржышча, якое дазваляе задушыць узбуджальнікаў хвароб і забяспечыць на будучы год прыбаўку ўраджаю збожжавых на 2-3 цэнтнеры. На палях, дзе праводзіцца лушчэнне, пры вясновым узворванні расход паліва скарачаецца да 30 % і на 15—20 % павялічваецца прадукцыйнасць ворнага агрэгата.

«Агрэгаты для лушчэння ржышча, якія прымяняюцца цяпер, не забяспечваюць патрэбную глыбіню апрацоўкі, а шырыня захопу не перавышае сямі метраў. Гэта зацягвае тэрміны правядзення лушчэння і забяспечвае эфектыўнае выкарыстанне агрэгатаў толькі на палях з пэўнай даўжынёй гоні. Для вырашэння дадзенай праблемы мы распрацавалі дыскавы лушчыльнік ЛДР-9 з шырынёй захопу дзевяць метраў, здольны працаваць практычна на ўсіх тыпах глеб і выконваць апрацоўку ржышча збожжавых культур кукурузы, рапсу і траў. Расход паліва пры гэтым складае 5-6 літраў на гектар, прадукцыйнасць за гадзіну — 10—14 гектараў. Такім чынам, за змену можна апрацоўваць каля ста гектараў», — адзначыў генеральны дырэктар цэнтра па механізацыі сельскай гаспадаркі.

Таксама ён дадаў, што на цяперашні момант са Шчучынскім рамонтным заводам ідзе завяршэнне распрацоўкі лушчыльніка з шырынёй захопу 12 метраў, што дазволіць праводзіць лушчэнне ржышча на яшчэ большых тэрыторыях. Акрамя таго, цяпер НПЦ па механізацыі сельскай гаспадаркі вядзе распрацоўку шматфункцыянальнага глебаапрацоўчага агрэгата, які будзе прымяняцца на ўсіх тыпах глеб і выконваць усе неабходныя аперацыі.

НАРЫХТОЎКА КАРМОЎ І СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ГРАБЛІ

Айчынныя навукоўцы ўжо правялі комплекс работ па ўдасканаленні тэхналогій нарыхтоўкі кармоў і стварэнні кормаўборачнай тэхнікі новага пакалення. Такая тэхніка зможа забяспечыць нарыхтоўку высакаякасных кармоў з травы і сіласных культур з мінімальнымі намі ў ўзроўні біялагічна непазбежных стратамі. Для павышэння якасці бабовых і бабова-злакавых травасумесяў распрацавана прылада для паўторнага плюшчэння і сушэння скошаных траў. «Яна дапаможа павысіць хуткасць сушкі сцёблаў бабовых траў да 20 % і захаванасць пажыўнай каштоўнасці на 10—15 %», — запэўніў Дзмітрый Комлач.

Акрамя таго, для павышэння якасці траў пры зграбанні высушаных масы ў цэнтры распрацаваны новыя граблі-валкавальнікі грабеньчатага тыпу з шырынёй захопу 9,5 метра. Цяпер, па словах гендырэктара цэнтра па механізацыі сельскай гаспадаркі, яны праходзяць дзяржаўныя выпрабаванні. Іх прынцып работы заснаваны на мінімальным кантакце зубоў з паверхняй глебы.

Сяргей КУРКАЧ.

Дабрачыннасць

Побач з тымі, каму гэта неабходна

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — члены Беларускага саюза жанчын перадалі дапамогу для дзяцей Данбаса

Гуманітарны груз у зону спецыяльнай ваеннай аперацыі даставяць прадстаўнікі Дабрачыннага фонду імя Аляксея Талая. Парламентарыі ўжо не першы раз дапамагаюць юным жыхарам, якія перажываюць няпросты перыяд. На гэты раз на Данбас перадаюцца ўсё тое, у чым дзеці найперш маюць патрэбу. На сабраныя членамі пярвічнай арганізацыі сродкі былі закуплены прадметы асабістай гігіены, падгузкі і дзіцячае харчаванне. Усе гэтыя важныя і патрэбныя для штодзённага камфортнага жыцця рэчы былі ўручаны асабіста заснавальніку фонду. Акрамя таго, у Палаце прадстаўнікоў адбылася шчырая размова парламентарыяў з Аляксеем Талаем.

На думку **члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Марыны ЛЯНЧЭЎСКАЙ,** самая вялікая несправядлівасць у свеце — гэта калі пакутуюць дзеці. «Данбас — дзевяць гадоў бед, дзіцячыя слёзы, слёзы маці, — заўважыла дэпутат. — Вядома, сітуацыя там вельмі сур'ёзная. Не хапае самага элементарнага: сродкаў асабістай гігіены, дзіцячага харчавання. У беларускіх жанчын — вельмі вялікае сэрца. Мы можам шмат аб тым гаварыць, але лічым, што больш правільна дзейнічаць. Мы побач з дзецьмі Данбаса, мы падстаўляем ім сваё плячо. Сёння, калі на Захадзе ў трэндзе палітыка двайных стандартаў, цынізм, абыякавасць, мы хочам памяняць гэтую рыторыку і сказаць усяму свету, што беларусы побач, што беларусы ніколі не пакінуць у бядзе тых, хто мае патрэбу ў дапамозе».

— Традыцыйна Беларускі саюз жанчын дапамагае ўсім дзецям, якія жывуць у нястачы, незалежна ад іх узросту і статусу, — адзначыла **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Ірына ЛУКАНСКАЯ.** — Мы выказваем вялікія словы ўдзячнасці і нізкі паклон Аляксею Талаю за тыя добрыя справы, якія ён робіць. За рэальную дапамогу жыхарам Данбаса, інвалідам, за дапамогу ў захаванні гістарычнай памяці. Жанчыны Палаты прадстаўнікоў з задавальненнем далучаюцца да добрых спраў і хочуць даведацца, чым мы яшчэ можам дапамагчы, каб аблегчыць лёс дзяцей, жыхароў Данбаса і зрабіць наш свет яшчэ больш добрым.

Дэпутаты абураныя справаздачамі Еўрапарламента, дзе чорнае выдаюць за белае, а белае робяць чорным. Маюцца на ўвазе заявы заходніх палітыкаў аб тым, што дзеці Данбаса прыязджаюць у нашу краіну незаконна. Вядома, што падобныя выказванні не маюць ніякіх прававых падстаў. «Дапамагаючы дзецям Данбаса, мы ім дорым часцінку дзяцінства, сонца, святла, — звярнула ўвагу Ірына Луканская. — Таму абвінавачванні ў наш бок абсалютна несправядлівыя. Я гаварыла з гэтымі дзецьмі. Прыязджаючы сюды, яны хочуць проста адпачыць, паспаць (без выбухаў, выстралаў) у цішыні, памыцца і смачна паесці. Базавыя патрэбы дзіцяці сёння не задавальняюцца ў зоне спецыяльнай ваеннай аперацыі. Мы проста хочам дапамагчы».

Фота БелТА.

Па словах **заснавальніка дабрачыннага фонду Аляксея ТАЛАЯ,** складана пераадаліць дапамогу беларусаў Данбасу. «Дзясяткі тон грузаў з самым неабходным за гэтыя некалькі гадоў туды адпраўлены, — паведаміў ён. — Мы працягваем такую работу. Канфлікт пакуль незавершаны, і ўсё новыя рэгіёны падвяргаюцца ўваходжанню ў складаны перыяд, калі пакутуюць грамадзянскія асобы, а дзеці сядзяць у падвалах — многія не хочуць эвакуіравацца са сваіх дамоў, гарадоў. Увесь беларускі народ не мог застацца ўбаку. І Прэзідэнт, і мы разумеем, што гэта не проста блізкія людзі, гэта нашы людзі. Мы — адзін народ. Гэты праект дапамогі людзям і дзецям Данбаса ўскалыхнуў усіх нашых людзей. Наш фонд кожны дзень атрымлівае сігналы аб тым, як можна дапамагчы. Вялікую дапамогу аказвае Беларускі саюз жанчын».

Дзякуючы Дабрачыннаму фонду імя Аляксея Талая не толькі дзясяткі тон гуманітарнага грузу былі дастаўлены на Данбас, а і тысячы юных жыхароў гэтага рэгіёна адпачылі ў найлепшых аздараўленчых лагерах Беларусі. Такі праект таксама будзе працягнуты. Ужо восенню чарговая група дзяцей Данбаса зноў наведае беларускія здраўніцы.

Вераніка КАНЮТА.

Добрая навіна

УЗРАСТУЦЬ ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ І ДАПЛАТЫ ДА ПЕНСІЙ

Што зменіцца з 1 жніўня?

З 1 жніўня змяняюцца памеры бюджэту пражыткавага мінімуму. А разам з гэтым узрастуць дапамогі на дзяцей, узроставыя даплаты да пенсій, дапамогі па доглядзе інвалідаў I групы ці асоб, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, сацыяльныя пенсіі інвалідам.

ПАВЯЛІЧЫЦЦА БПМ

На перыяд з 1 жніўня да 31 кастрычніка 2023 года зацверджаны памеры бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах, паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Бюджэт пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва ўстаноўлены ў памеры 364 рублёў 40 капеек, што на 3,5 % вышэй у параўнанні з нарматывам, які дзейнічаў з 1 мая да 31 ліпеня бягучага года.

Памеры бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва і па асноўных сацыяльна-дэмаграфічных групах (у цэнах чэрвеня 2023 года) складуць 403,94 рубля для працаздольнага насельніцтва, 271,09 рубля — для пенсіянераў, 232,41 рубля — для дзяцей да трох гадоў, 319,50 рубля — для дзяцей ад трох да шасці гадоў, 388,35 рубля — для дзяцей ад шасці да 18 гадоў.

У сувязі са зменаннем БПМ з 1 жніўня аўтаматычна пераглядаюцца ўбудаваныя ў сістэму сацыяльнай абароны розныя надбаўкі і павышэнні, а таксама асобныя сацыяльныя выплаты, якія вылічваюцца ад памеру БПМ.

ДЛЯ 400 ТЫСЯЧ ДЗЯЦЕЙ

Такім чынам, з 1 жніўня павялічваюцца памеры дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. З 1 жніўня 2023 года да 31 студзеня 2024 года памеры дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў складуць: на першае дзіця — 651,35 рубля; на другога і наступных дзяцей — 744,40 рубля; на дзіця-інваліда — 837,45 рубля. Памеры дапамогі выраслі на 7,5 працэнта.

З 1 жніўня да 31 кастрычніка 2023-га дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці (аднаразовая) складзе: пры нараджэнні першага дзіцяці — 10 БПМ, або 3644 рубля; пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — 14 БПМ, або 5 101,60 рубля; дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці (аднаразовая), — 100 % БПМ, або 364,40 рубля.

Дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў (штомесячная) павялічыцца да 182,20 рубля (50 % БПМ). Вырастуць і дапамогі на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў: на дзяцей, старэйшых за 3 гады, якія выхоўваюцца ў такіх сем'ях (акрамя дзіцяці-інваліда), — 50 % БПМ, або 182,20 рубля; на дзіця-інваліда, старэйшага за 3 гады, — 70 % БПМ, або 255,08 рубля.

Змяняецца і памер дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў (штомесячны): з I і II ступеню страты здароўя да спаўнення дзіцяці 18 гадоў і з III і IV ступеню страты здароўя да спаўнення дзіцяці ўзросту 3 гадоў — 100 % БПМ, або 364,40 рубля; з III і IV ступеню страты здароўя пасля спаўнення дзіцяці 3 гадоў — 120 % БПМ, або 437,28 рубля. Дапамога на дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека (штомесячная), складзе 70 % БПМ, або 255,08 рубля.

Нагадаем, што дапамогамі ў Беларусі ахоплена каля 400 тысяч дзяцей, у тым ліку дапамогай па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў — больш як 220 тысяч дзяцей. На выплату ўсіх відаў дапамог у 2023 годзе запланавана каля 3,5 мільярда рублёў, пры гэтым на дапамогу па догляду дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў — два мільярды рублёў.

ПАВЫСЯЦЦА ВЫПЛАТЫ ПАЖЫЛЫМ

З 1 жніўня павялічацца таксама ўзроставыя даплаты да пенсій, атрымальнікамі якіх з'яўляецца каля паўмільёна чалавек ва ўзросце 75 гадоў і старэйшых.

Памер гэтых выплат для асоб ва ўзросце 75-79 гадоў складзе 68,33 рубля, 80 гадоў і старэйшых (з улікам надбаўкі на догляд) — 136,65 рубля, а пры наяўнасці інваліднасці I групы —182,20 рубля.

Расходы на іх фінансаванне ў жніўні складуць каля 55 мільёнаў рублёў, у тым ліку каля 1,9 мільёна рублёў — на павышэнне ў сувязі з ростам БПМ. У цэлым выдатку на ўзроставыя даплаты ў 2023 годзе складуць каля 642 мільёнаў рублёў.

З 1 жніўня павялічваюцца памеры сацыяльных пенсій інвалідам і дзецям-інвалідам. Іх памеры складуць: інвалідам 1-й групы, у тым ліку інвалідам з дзяцінства — 400,84 рубля; інвалідам з дзяцінства 2-й групы — 346,18 рубля, інвалідам 2-й групы — 309,74 рубля, інвалідам 3-й групы — 273,30 рубля. Дзецям-інвалідам да 18 гадоў пры першай ступені страты здароўя — 291,52 рубля, другой — 309,74 рубля, трэцяй — 346,18 рубля, чацвёртай — 400,84 рубля.

Расходы на іх фінансаванне ў жніўні складуць больш за 22 мільёны рублёў, у тым ліку 750 тысяч рублёў на павышэнне ў сувязі з ростам БПМ. У цэлым расходы на выплату сацыяльных пенсій інвалідам у 2023 годзе складуць, паводле ацэнкі, 258 мільёнаў рублёў.

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Колькасць ахвяр нападзення тэрарыста-смяротніка ў Пакістане перавысіла паўсотню чалавек

Сама меней 54 чалавекі загінулі ў правінцыі Хайбер-Пахтунхва на паўночным захадзе Пакістана ў выніку выбуху, учыненага ў нядзелю тэрарыстам-смяротнікам на з'ездзе партыі «Збор ісламскіх багасловаў», якая ўваходзіць у кіруючую кааліцыю. Аб гэтым паведаміў тэлеканал Geo News са спасылкай на паліцыю. У зале, дзе ладзілася мерапрыемства, знаходзіліся 400 чалавек. Больш за 40 чалавек загінула на месцы, у тым ліку генеральны сакратар партыі Хар Зіяула. Паводле даных Geo News, рост колькасці загінулых у выніку тэракта звязаны са смерцю раней дастаўленых у бальніцу, якія атрымалі пры выбуху цяжкія раненні і траўмы. Адзначаецца, што цяпер у медустановах правінцыі праходзіць лячэнне звыш 80 пацярпелых у выніку тэракта. У Баджауры абвешчана надзвычайнае становішча. Бальніцы ў сталіцы правінцыі Пешавары пераведзены на ўзмоцнены рэжым работы. Многія з параненых знаходзяцца ў крытычным стане. Прэм'ер-міністр Пакістана Шахбаз Шарыф распарадзіўся пачаць расследаванне і знайсці вінаватых.

У Швецыі назвалі сітуацыю з бяспекай самай сур'ёзнай з часоў Другой сусветнай вайны

Швецыя знаходзіцца ў самай сур'ёзнай сітуацыі ў галіне палітыкі бяспекі з часоў Другой сусветнай вайны пасля акцыі са спаленнем Карана. Урад аналізуе становішча, якое склалася, напісаў у Instagram прэм'ер-міністр Швецыі Ульф Крыстэрсан пасля гутаркі з дацкай калегай Метэ Фрэдэрыксен, паведаміла ТАСС.

Урад Даніі заявіў, што вывучыць магчымасць не даваць дазвол на правядзенне грамадскіх сходаў у асаблівых сітуацыях, калі абражаюцца іншыя краіны, культуры і рэлігіі і калі гэта можа мець сур'ёзныя негатыўныя наступствы для бяспекі Даніі. «У Швецыі мы таксама пачалі работу па аналізе прававой сітуацыі, у тым ліку закона аб грамадскім парадку, з мэтай разгляду мер па ўмацаванні нашай нацыянальнай бяспекі», — напісаў Крыстэрсан.

Улады Пекіна выпусцілі «чырвонае» папярэджанне з-за ліўняў

На фоне моцных дажджоў улады кітайскай сталіцы выпусцілі найвышэйшае «чырвонае» папярэджанне аб геалагічных катастрофах і метэаралагічных рызыках, дзясяткі тысяч жыхароў кітайскай сталіцы эвакуіруюць з-за дажджоў, паведамляецца аб загінулых, перадае РІА «Навіны». Як паведамілі гарадскія метэаралагічныя службы, найвышэйшае папярэджанне звязанае з тым, што ў некаторых раёнах горада існуе павышаная рызыка апоўзняў, селяў, абвалаў грунту. Раней Пекінская метэаралагічная станцыя таксама аб'яўляла аб «чырвоным» найвышэйшым узроўні папярэджання з-за моцных дажджоў у розных раёнах Пекіна. Найбольшая колькасць ападкаў прыпала на раёны Фаншань на паўднёвым захадзе Пекіна і Мэнъюэгоу на захадзе кітайскай сталіцы. Моцныя ліўні паўплывалі на работу грамадскага транспарту. Рух спынілі на ўсёй лініі метро Яньфан. Паведамлялася, што пекінскі міжнародны аэрапорт Шаўду адмяніў 40 рэйсаў.

На свае вочы

ХОЦІМСК МЯНЯЕ ФАРМАТ

Сёлета райцэнтр стане сталіцай абласнога свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі» — і тут адчуваецца ўздым па ўсіх кірунках. На вуліцах працуе дарожная тэхніка, будаўнікі наводзяць марафет на фасадах дамоў, на завяршальным этапе будаўніцтва басейна. Наогул увесь Хоцімск сёння — адна вялікая будоўля. І планы — самыя аптымістычныя.

СТАЎКА НА АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ

Летась у Хоцімску былі пабудаваныя два дамы напалову арэндныя — адзін васьмікватэрны двухпавярховік і двухкватэрны сядзібнага тыпу. Жыхары ўжо справілі там навасэлле. Гэта і маладыя спецыялісты, і кіруючыя работнікі. Ужо гатовы праект 12-кватэрнага арэнднага жылога дома ў цэнтральнай частцы Хоцімска. **Намеснік старшыні па будаўніцтве Хоцімскага райвыканкама Аляксандр АНЖЭНКА** заўважае, што цяпер людзі мабільныя, не жадаюць быць прывязанымі да аднаго месца. Таму попыт павышаны.

— Ёсць жадаючыя і на індывідуальнае будаўніцтва, якім выдзяляюцца зямельныя ўчасткі, — расказвае ён. — І глыбінка — не выключэнне. Напрыклад, знайшоўся чалавек, які захацеў пабудаваць дом у вёсцы Узлогі. Яго не спыніла нават тое, што населены пункт аддалены і маланаселены.

Сёлета ў раённым цэнтры акцэнт робіцца на капітальны рамонт жылля. Гэта, лічы, цалкам абнаўляецца дом: мяняецца дах, унутрыдамавыя інжынерныя сеткі, фарбуецца фасад. Новае жыццё атрымаюць пяць шматкватэрных жылых дамоў агульнай плошчай болей чым дзевяць тысяч квадратных метраў.

— Для Хоцімска гэта шмат, — удакладняе суразмоўнік. — Акрамя таго, да «Дажынак» рамантуецца шмат сацыяльных аб'ектаў — Дом культуры, бальніца, дарогі...

У Хоцімску актыўна развіваюць прыярытэтны ў краіне напрамак па будаўніцтве электрычных дамоў. Адзін такі двухпавярховік у цэнтры горада ўжо ёсць. Але яшчэ больш зацікаўленыя пераводам на электрычны варыянт ацяплення ўладальнікі індывідуальнага жылля. Па словах **загадчыка сектара ідэалагічнай работы і па справах моладзі Хоцімскага райвыканкама Аляксандра ЦІШЧАНКІ**, ледзь не на кожным пасяджэнні райвыканкама разглядаюцца такія звароты ад насельніцтва. Раней акцэнт рабіўся на газавае ацяпленне, цяпер ёсць выбар.

СВОЙ ДОМ — ГЭТА ТАБЕ НЕ КВАТЭРА

Насельніцтва Хоцімска больш паважае прыватнае жыллё. Калі ўязджаеш у населены пункт, звяртаеш увагу на тое, з якой любоўю і густам упрыгожваюць свае сядзібы месцічы. Асабліва прываблівае мноства кветак.

Выконваючы абавязкі старшыні Бярозкаўскага сельсавета Аляксандр ЯРОМІН — адзін са шчаслівучыкаў. Некалькі гадоў таму ён атрымаў участак непадалёк ад цэнтра горада і цяпер вядзе на ім актыўнае будаўніцтва.

— Побач камунікацыі, у доме можна зрабіць усе выгоды, — пералічвае ён плюсы. — Але галоўнае — прырода. Рэчка Жадунька за агародам, а за ёй — луг, лес. Птушкі спяваюць. Гэта ж выдатна! У доме зробім электраацяпленне, але ад печкі таксама не будзем адмаўляцца. Без печкі жыць нецікава.

Аляксандр, каб расказаць, чым яму падабаецца Хоцімск, прапанаваў праехацца па гарадскім пасёлку. І калі пра такія славутасці, як кола агляду (адзінае на ўсю вобласць!) у парку атракцыёнаў (гэтым таксама не кожны райцэнтр можа пахваліцца), жамчужыну зямлі хоцімскай

Андрэй і Алена ШАМБЫ сціраюць межы паміж горадам і вёскай.

храм Святой Тройцы, створаны вядомым у вобласці і за яе межамі архімандрытам Кірылам, я ведала, то цудоўнае месца адпачынку на рэчцы Жадуньцы з пляжам і дзіцячай зонай для купання было адкрыццём. Тут сапраўды вельмі хораша. Яшчэ адзін пляж ёсць на рацэ Бесядзі. Наогул у райцэнтры аж тры ракі. Акрамя дзвюх вышэйназваных, яшчэ і Альшоўка.

У Хоцімску ёсць добрыя ўмовы для жыцця — дзве сярэднія школы, каледж, дзе можна атрымаць прэстыжную прафесію кіроўцы або газазваршчыка; бальніца, гісторыка-краязнаўчы музей, Дом культуры. Калі б моладзь больш цаніла сініцу ў руках і не гналася за журавлём у небе, Хоцімск стаў бы адным з прэстыжных месцаў для жыцця на зямлі, не сумняваецца суразмоўнік.

ПРАЕКТ ПАД НАЗВАЙ ГОРНЯ

Яго метадычна ажыццяўляюць вядомыя ўсім у райцэнтры індывідуальныя прадпрымальнікі Андрэй і Алена Шамбы. Яны жывуць у Горні і маюць намер зрабіць з вёскі райскі куточак. У абаіх за плячыма вопыт жыцця ў вялікіх гарадах, але нідзе яны не адчуваюць сябе так хораша, як у Хоцімску і роднай Горні.

— Нам тут вельмі камфортна, — кажа Андрэй, і Алена яго падтрымлівае. Дарэчы, маладая жанчына родам з Масквы. Кінула сталіцу і змяніла сваё жыццё на 180 градусаў, каб быць з каханым побач. І вось ужо звыш дзесяці гадоў агітуюць праз інтэрнэт маладыя сем'і пераязджаць у вёску.

— Цяпер дапамагаем перасяліцца ў нашу вёску сям'і Яўгеніі з Тулы, — дзеліцца навіной Алена. — Яна знайшла нас праз сацыяльную сетку, напісала і прыехала. Ёй усё спадабалася. Не магла паверыць, што 25 «сотак» зямлі ў нас даюць бясплатна, пакуль сама не атрымала. Дом ужо пабудаваны, засталося толькі зрабіць адстройванне ўнутры.

Насельніцтва Горні — усяго 18 чалавек. Андрэй і Алена спадзяюцца, што змогуць пераманіць сюды яшчэ дзве-тры сям'і, і тады справы пойдуць угару. Нядаўна яны купілі другі дом у Горні. Алена смяецца: не маглі дазволіць, каб яго разабралі. І дадае, што яны з мужам нават гатовыя падарыць яго руплівым людзям, калі тыя згодныя будуць разам адраджаць вёску. Андрэй, у сваю чаргу, прапануе развіваць сельскі клуб, які ён аднавіў, і гатовы аддаць яго пад цікавы праект творчаму чалавеку. Калі ў вёсцы з'яўляюцца энергічныя і неабыякавыя людзі, населены пункт набывае новае жыццё. Галоўнае, каб навасёлы не замыкаліся на сабе. Андрэй, напрыклад, абкошвае не толькі сваю тэрыторыю, але і агульную. Калі акуратна вакол, то і на душы весела. У вёсцы ёсць сажалка, якую сужэнцы зарыбілі. Яны мараць яе пачысціць, зрабіць масткі, купіць катамараны, насадзіць кветак. Усё гэта трэба даглядаць. З сумленнымі суседзямі будзе нескладана. «Чалавек павінен быць не спажыўцом, а творцам», — пераканаюць яны.

Ёсць, вядома, пытанні, якія голым энтузіязмам не вырашыш. Тая ж дарога да Горні. Трэба, каб яе час ад часу рамантавалі, грэйдзіравалі. Андрэй звярнуўся ў сельсавет, там параілі з дарожнікамі пагутарыць. «Але ж гэта не работа, — лічыць малады чалавек. — Калі арганізацыя адказвае за стан дарогі, павінен быць наладжаны кантроль. Навошта ёй пра гэта нагадваць?» Дрэнная дарога, на думку сужэнцаў, адзін з фактараў, які адпужвае людзей ад вёскі, бо сёння амаль у кожнага машына і пытанне якасці дарогі стаіць на першым месцы.

У Андрэя і Алены ў Горні вялікі прыгожы дом, ён аснашчаны сучаснай бытавой тэхнікай. Нядаўна яны адкрылі ў Хоцімску першы ў раёне пункт выдачы тавараў Wildberries. Сіл шмат укладзена, але і аддача ёсць.

— Атрымаўся гіпермаркет па-хоцімску, — радуецца Алена. — Попыт літаральна на ўсё — ад мэблі да ежы. Раней месца было непапулярнае, а цяпер народ ідзе. Яшчэ і пару чалавек працаўладкавалі.

Знайшліся таксама сілы і грошы на тое, каб аднавіць у цэнтры Хоцімска будынак мінулага стагоддзя, мараць здаць яго ў арэнду якому-небудзь рытэйлеру. Гэтым ідэі ініцыятыўнай пары не заканчваюцца. Яны ўжо пагаварваюць пра кластар, які можна было б стварыць вакол Горні і Хоцімска.

— Сёння ў вёсцы ёсць інтэрнэт, а гэта — рэальная магчымасць працаваць і вучыцца на адлегласці, — дадае Алена. — Я цяпер праходжу курсы, якія дапамогуць мне ў развіцці Хоцімскага раёна.

— Мы жывём у такі час, калі мяжы паміж горадам і вёскай няма, — кажуць сужэнцы. — Навошта чапляцца за горад? Там шум, пыл, асфальт. А мы дыхаем свежым паветрам, побач цудоўны лес. Інтэрнэт дазваляе быць усюды адначасова, а заадно развівацца. Людзі рвуцца ў горад, дзе шалёная канкурэнцыя і рызыкі. У глыбінцы канкурэнцыі няма, і гэта самы вялікі плюс. А яшчэ можна эксперыментаваць.

— Быў перыяд, калі я шукала сябе ў птушкагадоўлі — купіла неабходнае абсталяванне і вывела звыш дзвюх тысяч галоў, — удакладняе былая масквічка. — Але хутка зразумела, што гэта не маё, і адмовілася. Цяпер раблю стаўку на развіццё сферы паслуг і гандлю. Гэта тое, што сёння запатрабавана ў глыбінцы.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.
Хоцімскі раён.

P.S. *Сужэнцы спадзяюцца, што нехта з чытачоў «Звязды» пажадае заняцца перспектыўным бізнесам у Хоцімскім раёне, і яны стануць партнёрамі.*

Першы двухпавярховы электрадом у Хоцімску.

Аляксандр ЯРОМІН са старога зрубу робіць электрадом.

Гараджане ў вёсцы

ДОМІК З ВІДАМ НА ЛЕС

Фізіка і лірыка жыцця пасля гарадскога рытму

Сям'я РАБКАВЕЦ з Калінкавіцкага раёна восем гадоў таму памяняла жыццё ў Мінску на мару пабудаваць сваё шчасце ў сельскай мясцовасці. Маладыя бацькі Ілья і Анаіт цяпер жывуць, працуюць, гадуюць трох дачок у аграгарадку Сырод. Набыты стары дом перабудавалі, а ў будучым плануюць адкрыць аграсядзібу. Сёлета яны заваявалі другое месца ў гранд-фінале конкурсу «Уладар вёскі». Такі поспех — заслуга ўсіх членах сямейнай каманды: Ільі, Анаіт, васьмігадовай Арыны, чатырохгадовай Ангеліны і маленькай Міраславы.

«Горад» адсЫпаўся, прырода прыняла

Пазнаёміліся будучыя муж і жонка ў сталіцы. Сустрэліся на карпаратыве, спадабаліся адно аднаму з першага позірку, а пасля ўжо не расставаліся.

— Ілья адразу расказаў, што бачыць сябе і сваю будучую сям'ю толькі ў сельскай мясцовасці. Я ж была абсалютна гарадская, у мяне было цалкам гарадское кола зносін, таму многія сябры здзіўляліся, чаму я абрала Ілью, які хоча жыць і працаваць на зямлі. Калі мы пераехалі ў вёску, гарадскія знаёмыя «адсЫпаліся», — згадвае Анаіт.

Пасля Мінска маладажоны паспрабавалі пажыць крыху ў Брэсце, потым у Калінкавічах, а шэсць гадоў таму знайшлі сваё месца сілы. Так яны называюць свой дом і ўчастак у аграгарадку Сырод, што за дзевяць кіламетраў ад Калінкавіч. Яшчэ калі яны жылі ў Мінску, Ілья і Анаіт марылі, якім будзе іх будучы вясковы дом. Хацелася, каб абавязкова — з відам на лес. Мары спраўдзіліся.

Стары вясковы дом мужчына перарабіў для жыцця вялікай сям'і. Па словах Ільі, прыкладам працавітасці, нават неўтаймаванасці ў рабоце для яго застаецца бацька Генадзь Мікалаевіч Рабкавец, які стварыў незвычайную вясковую сядзібу ў роднай вёсцы Пагост-Загародскі ў Пінскім раёне на Брэстчыне.

У Сыродзе Ілья адразу ўладкаваўся жывёлаводам у мясцовую гаспадарку — СВК «Дружба-Аўцюкі». Хутка яму прапанавалі работу на трактары, потым — пагрузчыку, а пасля былы сталічны жыхар стаў загадчыкам сельгаскомплексу. Цяпер бацька сям'і працуе аператарам «харвестара» ў Калінкавіцкім лясгасе.

«Раскрыла сябе як асоба...»

— Праз шэсць гадоў жыцця ў Сыродзе магу дакладна сказаць, што менавіта ў вёсцы раскрыла сябе як жанчына і як асоба, — падзялілася Анаіт.

Да «дэкрэтных» маладая жанчына паспела папрацаваць у сельскім клубе культарганізатарам. Працягвала вучыцца і развівацца ў любімай справе — вытворчасці прыроднай касметыкі: адвучылася ў маскоўскай школе на водаратэрапеўта. Займаецца натурапатыяй і траўніцтвам, вырабляе эфірныя алеі, натуральную парфуму, духі, гідралаты.

— Калі толькі пасялілася ў вёсцы, па ўсходах кроп ад морквы не адрознівала. Баялася жучкоў-чарвячкоў. Цяпер ужо і агарод вяду. Быў перыяд, калі мы трымалі курэй, свіней. Неяк муж быў на змене, свінка парасілася, прыйшлося самой прымаць папаўненне. Цяпер з гаспадаркі ў нас толькі мой агарод і «плантацыя» буякоў, каб былі вітаміны для дзяцей, — расказвае суразмоўніца.

Маладая маці амаль штодзень выязджае ў райцэнтр. Старэйшыя дочкі займаюцца ў музычнай і мастацкай школах, вучацца вакалу. Міраслава ўсюды суправаджае маму і сясцёр.

— У вялікіх гарадах ёсць адлегласці і большыя. Так што гэта не праблема. У наш Сырод шмат маладых сем'яў прыехала жыць з горада, — растлумачыла Анаіт.

Хочацца знаёміцца і сябраваць

Яны з мужам пагадзіліся ўзяць удзел у конкурсе «Уладар вёскі», спачатку менавіта каб падтрымаць свой сельсавет і раён.

— Не планавалі ехаць на вобласць і краіну. Але выйшла нечакана. Мы не пісалі сцэнарыі, не прыдумвалі пастаноўкі. Проста сваімі словамі расказвалі пра сям'ю, бацькоў, радавод. Пасля раённага этапу, калі сумняваліся, ці працягваць удзел, нас вельмі падтрымала мая мама — Алена Мікалаеўна Грыгаран. Сказала: «Дзеткі, давайце!», і мы рашыліся, — згадала Анаіт. — На рэспубліканскім этапе глядзелі на ўсіх і душа цешылася, настолькі ўсе сем'і былі класныя. Вельмі хацелася, каб пасля такіх конкурсаў праводзілі асобны вечар-сустрэчу для ўсіх удзельнікаў, каб можна было пазнаёміцца бліжэй. Дзеці адразу пасябравалі. Нам, маладым бацькам, хочацца знаёміцца, дзяліцца і пераймаць досвед адзін аднаго.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота з архіва герояў.

Турыстычная інфраструктура

Дарога вядзе ў Сонічы

Як аграсядзіба садзейнічае новаму абліччу беларускай вёскі

Гэты населены пункт Гродзеншчыны знаходзіцца ў баку ад цэнтральных магістраляў і шумнага горада. Сонічы — вёска невялікая і ціхая.
І ўсё ж ёсць тут адна адметнасць. На тэрыторыі населенага пункта знаходзіцца адразу некалькі аграсядзіб, дзякуючы якім Сонічы маюць даволі прэзентабельны выгляд.

Доўгі час тэрыторыя вёскі ўваходзіла ў склад пагранічнай зоны. Рух сюды быў абмежаваны. Але з пачаткам рэканструкцыі Аўгустоўскага канала сітуацыя змянілася. Абмежаванні знялі, а вёска пачала аднаўляцца.

Першай ластаўкай стала аграсядзіба мясцовага прадпрымальніка Генадзя Садкоўскага. Праўда, доўгі час ураджэнец вёскі жыў у Калінінградзе. Застаўся там пасля службы ў арміі, а потым адкрыў і сваю справу. Каля дачы паставіў некалькі гасцявых домікаў, лазню. Кажа, што тады, у пачатку 2000-х, такі рух пачынаў фарміравацца і даволі хутка нарастаць.

— Гэта быў мой першы вопыт так званага гасцявога бізнесу, — успамінае прадпрымальнік. — З цягам часу прыйшлі неабходныя навыкі, а калі пераехаў сюды, вырашыў справу працягваць.

Першапачатковы капітал застаўся ад продажу актываў у Калінінградзе — кафэ, аўтамыйкі, нерухомасці. Гэтыя сродкі дзесяць гадоў таму былі ўкладзены ў беларускі бізнес.

Праўда, найперш прыйшлося прывесці ў парадак бацькоўскі дом. З гэтага і пачалася, можна сказаць, будучая «раскрутка» аграсядзібы. Паспрыяла рамонту і свая лесапільня, якая была арганізавана ў старым памяшканні калгаснай фермы. Паралельна з рамонтам старога дома стартавала будаўніцтва новага.

— Сітуацыя была даволі спрыяльная для развіцця аграэкатурызму. Таму за кароткі тэрмін было пабудавана некалькі дамоў, усе драўляныя. Раённыя ўлады выдзелілі яшчэ адзін зямельны ўчастак, у выніку атрымалася тры дамы, лазня, альтанка, вадаём, пірс, — пералічвае сваю інфраструктуру Генадзь Іванавіч.

Дарэчы, тэрыторыя населенага пункта будзе пашырацца, што дасць магчымасць асвоіць яшчэ ўчастак у складзе комплексу.

Вёска Сонічы невялікая, але ўтульная. Станоўчае ўражанне стварае аграсядзіба, якая трапляе на вочы пры ўездзе. Прыгожыя драўляныя дамы ў адзін рад нагадваюць казачны ландшафт. Крыху далей — яшчэ дом з бярвення. Ад гэтага аблічча вёскі становіцца больш выразным, адметным, акуратным. Мой суразмоўнік слушна заўважае, што за ўсім гэтым стаіць вялікая праца. Тое, што зарабляецца, усё ўкладваецца ў развіццё аграсядзібы — інфраструктуру, бытавыя прыборы. Без гэтага бізнес не будзе развівацца. Справа Садкоўскага стала прыкладам і для іншых жыхароў вёскі.

— Акуратныя сядзібы не толькі тут, — заўважае герой гутаркі, — самі вяскоўцы таксама стараюцца падцягвацца, глядзяць за сваімі дамамі, прыводзяць іх у парадак. Відавочна, што ў людзей з'явілася жаданне надаць свайму жытлу прыгожы і дагледжаны выгляд.

Вядома, месцазнаходжанне аграсядзібы накладае і свае абмежаванні і, магчыма, нязручнасці, бо патрабуе выканання пэўных нормаў. Напрыклад, улічваць вячэрні час і захоўваць парадак. Усе госці папярэджваюцца аб гэтым.

Закранулі магчымасць далейшага развіцця аграгурыстычнага бізнесу. Як вядома, з 1 ліпеня рамеснікі і гаспадары аграсядзіб павінны плаціць новы падатак — на прафесійную дзейнасць. Мой суразмоўнік паясніў, што для тых, хто прайшоў атэстацыю, згодна з рашэннем раённай камісіі, стаўка падатку застаецца на тым жа ўзроўні, гэта значыць адна базавая велічыня ў месяц.

— Камісія па прыёмцы аграсядзіб разам з кантрольнымі функцыямі аказвае ў тым ліку і значную дапамогу. Указваецца, напрыклад, што трэба зрабіць, каб адпавядаць патрабаванням архітэктуры, санэпіднормам, ахове прыроды, бяспецы і гэтак далей. Пасля таго як заўвагі, якія часам з'яўляюцца, ліквідуюцца, райвыканкам прымае рашэнне на дазвол дзейнасці. Пакуль забароны на спыненне работы не было, атэстацыю праходжу своечасова, — паведаміў гаспадар сядзіб.

Блізкасць Аўгустоўскага канала таксама мае свае плюсы. Прычым для абодвух бакоў. Па словах бізнесмена, канал да гэтай пары не мае патрэбнай інфраструктуры нават ва ўмовах свабоднай эканамічнай зоны, якая тут дзейнічае. Усе спробы прыцягнуць інвестараў, у тым ліку замежных, не прынеслі поспеху. Аграсядзібы сталі астраўкамі «жывой» інфраструктуры на канале. Менавіта яны даюць магчымасць затрымаць турыста на некалькі дзён. Некаторыя прыязджаюць сюды менавіта для таго, каб пакатацца на параходзе, паўдзельнічаць у сплавах на байдарках. Генадзь Іванавіч прызнаецца, што асабліва любіць прымаць удзельнікаў марафонаў, спартыўных спаборніцтваў, веларабегаў. Як правіла, яны вельмі дысцыплінаваныя, акуратныя. Няма асабліва клопатаў пасля іх ад'езду. А калі патрэбна дапамога для прыняцця гасцей, гаспадар аграсядзібы спадзяецца толькі на аднавяскоўцаў. Нікога не адмаўляецца ад падпрацоўкі, паколькі пастаянных нанятых работнікаў на сядзібе няма.

Таксама вяскоўцы дапамагаюць з гароднінай.

— У аграэкатурызме прадугледжваецца такая асаблівасць — частаваць гасцей экалагічнай прадукцыяй. Але апрацоўваць свой участак я проста не ў стане. Таму сваім гасцям рэкамендую суседзяў, якія вырошчваюць сельгаспрадукцыю. У кожнага тутэйшага ёсць свой агарод, у іх можна набыць гародніну, яйкі. Такім чынам вяскоўцы таксама маюць нейкі прыбытак, яны зацікаўленыя ў тым, каб вырошчваць гародніну, садавіну, ягады. Дзякуючы таму, што сюды прыязджаюць людзі, у вёсцы сёлета адкрылі краму, — расказаў Садкоўскі аб сваім узаемадзеянні з аднавяскоўцамі.

Пры развітанні заўважаю, што цяпер Гродзенскі рэгіён наладжвае партнёрскія сувязі з Калінінградам, адкуль пачаў сваю справу беларускі бізнесмен. «Гэта вельмі добра, — згаджаецца ён, — бо там пражывае даволі шмат беларусаў. Было б добра, каб яны з расійскімі сябрамі завіталі ў нашы прыгожыя мясціны».

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

З нагоды

Кітайска-беларускія адносіны дасягаюць новых вышынь

Кітайскі народ, як і беларускі, на працягу гісторыі спазнаў беды і пакуты, выкліканыя спусташальнымі войнамі, таму яшчэ больш імкнецца да міру і шануе мір. Важнасць гэтага адзначыў аташэ па пытаннях абароны пры пасольстве КНР у Беларусі старшы палкоўнік Лю ЧЖЭ на ўрачыстым мерапрыемстве з нагоды 96-годдзя з дня стварэння Народна-вызваленчай арміі Кітая.

Як падкрэсліў аташэ, «моцная краіна перш за ўсё павінна мець моцную армію, толькі моцная армія можа забяспечыць нацыянальную бяспеку». Ён таксама паведаміў, што распрацаваны шэраг стратэгічных планаў і мер, накіраваных на паскарэнне мадэрнізацыі нацыянальнай абароны і ўзброеных сіл. Аташэ адзначыў, што «ісці шляхам мірнага развіцця — непахісная нацыянальная воля і стратэгічны выбар Кітая. Краіна праводзіць незалежную і самастойную мірную знешнюю палітыку. Рост ваеннай моцы КНР — гэта рост міратворчых сіл у свеце і рост сіл міжнароднай справядлівасці». Як паведаміў Лю Чжэ, за апошнія 30 гадоў Кітай накіраваў больш за 50 тысяч міратворцаў у больш як 20 краін і рэгіёнаў для ўдзелу ў міратворчых аперацыях ААН, стаўшы ключавой сілай арганізацыі ў падтрыманні міру. Цяпер КНР з'яўляецца найбуйнейшым пастаўшчыком войскаў для міратворчых аперацый сярод пастаянных членаў Савета Бяспекі ААН.

Як адзначыў аташэ, «у апошнія гады пад стратэгічным кіраўніцтвам лідараў дзвюх дзяржаў кітайска-беларускія адносіны бесперапынна дасягаюць новых вышынь». Як падкрэсліў Лю Чжэ, «у далейшым абмены і практычнае супрацоўніцтва паміж узброенымі сіламі Кітая і Беларусі, грунтуючыся на ўжо дасягнутым узроўні, прынясуць яшчэ больш вынікаў і сумесна ўнясуць вялікі ўклад ва ўмацаванне міру ва ўсім свеце і рэгіянальнай стабільнасці».

Кітай у знешняй палітыцы працягвае ісці курсам на ўмацаванне рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі, адзначыў **міністр абароны Беларусі Віктар ХРЭНІН.** «Армія Кітая — надзейны гарант міру і працвітання дзяржавы. Яна з гонарам вытрымала ўсе нягоды, якія выпалі на долю кітайскага народа. Сёння ў НВАК працягваецца маштабнае рэфармаванне. Пры гэтым упор робіцца на распрацоўку новых відаў узбраенняў і ваеннай тэхнікі, шырокае ўкараненне лічбавых і інтэрнэт-тэхналогій, усебаковае навучанне і падрыхтоўку ваеннаслужачых да вядзення баявых дзеянняў з улікам вопыту сучасных узброеных канфліктаў», — заявіў Віктар Хрэнін. Як адзначыў міністр абароны, «у знешняй палітыцы Кітай прадаўжае ісці курсам на ўмацаванне рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі. Супрацоўніцтва з Кітаем у цэлым, як і яго ваенны складнік у прыватнасці, з'яўляецца найважнейшым прыярытэтам знешняй палітыкі. Надзейным фундаментам для яго развіцця застаюцца адносіны дружбы паміж дзяржавамі, якія склаліся гістарычна», — лічыць Віктар Хрэнін.

Як падкрэсліў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се СЯАЮН,** кітайска-беларускае супрацоўніцтва дынамічна развіваецца ва ўсіх сферах. Дыпламат звярнуў увагу, што ў верасні мінулага года кіраўнікі дзвюх дзяржаў прынялі сумеснае рашэнне ў Самаркандзе аб павышэнні ўзроўню кітайска-беларускіх адносін да ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, дзякуючы чаму ўзаемадзеянне ў чарговы раз здзейсніла гістарычны скачок. Падчас сёлетняга дзяржаўнага візіту Прэзідэнта Беларусі ў Кітай кіраўнікі дзвюх краін падпісалі сумесную заяву аб далейшым развіцці адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства ў новую эпоху, якая, на думку пасла, з'яўляецца новым маштабным планам паглыблення супрацоўніцтва паміж нашымі дзяржавамі ў розных галінах.

Па выніках мінулага года Кітай стаў другім гандлёвым партнёрам Беларусі пасля Расіі. Тавараабарот пабіў рэкорд і дасягнуў 5,8 мільярда долараў. «Сёлетнія паказчыкі яшчэ больш уражальныя. У першыя пяць месяцаў тавараабарот паміж нашымі краінамі склаў 3,7 мільярда долараў, павялічыўшыся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 127 працэнтаў. Гэта проста невераго дны вынік, які стаў магчымы дзякуючы сумесным намаганням нашых краін».

Як бачым, Мінск і Пекін пакараюць новыя вяршыні і дасягаюць вынікаў, якія раней здаваліся немагчымымі.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Векапомнае

АД ПОШУКАЎ ДА ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ АБ ПАРТЫЗАНАХ У ІНТЭРНЭЦЕ

Якія праекты дапамагаюць захоўваць гістарычную памяць?

Каб захаваць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне, у нашай краіне актыўна рэалізоўваюцца патрыятычныя праекты, накіраваныя на ўвекавечанне подзвігу яе ўдзельнікаў. Як вядзецца пошукавая дзейнасць і як дагэтуль на тэрыторыі нашай краіны знаходзяць астанкі загінулых падчас тых падзей? Які рэгіён можна назваць флагманам у рабоце па алічбаванні помнікаў часоў ВАВ? Як захоўваецца памяць аб партызанскім руху? Пра гэта расказалі эксперты.

Фота БелТА.

Самая жаданая знаходка — медальён

Пошукавую дзейнасць на тэрыторыі нашай краіны вядзе спецыялізаваная вайсковая часць Міністэрства абароны — 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён. Як паведаміў **начальнік упраўлення Узброеных Сіл па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Сяргей КОРНЕЎ,** за час свайго існавання (з 1995-га да цяперашняга часу) вайскоўцы батальёна знайшлі і перапахавалі астанкі больш за 45 тысяч загінулых, з іх вайскоўцаў Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі — каля 27 тысяч, ахвяр вайны — звыш 12 тысяч, ахвяр супраціўлення — больш за 130 чалавек, ваеннаслужачых часоў Першай сусветнай вайны — больш за 4 тысячы, салдат вайны 1812 года — больш за 45. Таксама былі знойдзены ўзнагароды, медальёны, стралковая зброя, выбухованебяспечныя прадметы, патроны і іншыя спадарожныя знаходкі.

Устаноўлены звесткі аб чатырох тысячах загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны (больш за дзве тысячы) і падчас Першай сусветнай (больш за 1,5 тысячы). Напрыклад, летась воіны-пошукавікі адпрацавалі 105 аб'ектаў, на якіх знайшлі астанкі больш за 2300 ваеннаслужачых, устанавілі 122 імені загінулых. Такая работа працягваецца і сёлета, але ў большым аб'ёме — адпрацоўваюцца 136 аб'ектаў.

Вядуцца ваенным ведамствам пошукі і ў межах крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады ВАВ, расследаваннем якой займаецца Генеральная пракуратура. У 2021 годзе асабовым складам 52-га батальёна было адпрацавана 12 пошукавых аб'ектаў у пяці абласцях, знойдзены астанкі больш за 2,5 тысячы загінулых. У 2022 годзе адпрацавана ўжо 26 пошукавых аб'ектаў у шасці абласцях і Мінску, знойдзены астанкі больш за 700 загінулых, вызначаны межы 717 пахаванняў ахвяр генацыду, устаноўлены звесткі аб чатырох загінулых. Сёлета работа працягваецца.

— У асноўным гэта нявызначаныя пахаванні, пра якія раней не ведалі і звесткі пра якія былі ўстаноўлены падчас расследавання гэтай крымінальнай справы, — адзначыў Сяргей Корнеў.

Актыўна ў сваёй рабоце ўпраўленне па ўвекавечанні памяці і пошукавы батальён супрацоўнічаюць з грамадскімі арганізацыямі як Беларусі, так і Расіі. Сёлета з удзелам беларускіх грамадскіх аб'яднанняў запланавана правядзенне 14 пошукавых работ, на сёння адпрацавана дзевяць аб'ектаў. І яны таксама даюць свой плён. Напрыклад, падчас раскопак, праведзеных у Быхаўскім раёне, у чэрвені было знойдзена 27 медальёнаў. Для пошукавікаў гэта адна з самых жаданых знаходак, бо яна дазваляе ўстанавіць даныя аб чалавеку, якому ён належаў.

— На жаль, устанавіць інфармацыю пра ваеннаслужачых удалося толькі па дзесяці медальёнах, але і гэта дастойны вынік, — кажа Сяргей Корнеў. — У некаторых выпадках удалося выявіць іх блізкіх і паведаміць ім пра лёс продкаў.

Яшчэ адной жаданай знаходкай для пошукавікаў з'яўляюцца дзяржаўныя ўзнагароды. Яны маюць рэгістрацыйны нумар, па якім таксама можна ўстанавіць прыналежнасць канкрэтнаму ўладальніку. Дарэчы, цяпер сумесна з клубам «Айчына» з Рэспублікі Татарстан (Расія) праводзяцца пошукавыя работы ў Зэльвенскім раёне. Апрача іншых знаходак, быў адшуканы і Ордэн Чырвонай Зоркі. Цяпер вайскоўцы імкнуцца ўстанавіць, каму ён належаў, каб знайсці блізкіх і паведаміць пра лёс іх продка.

Сёлетні пошукавы перыяд працягваецца, традыцыйна ён доўжыцца да лістапада. Затым час для архіўна-даследчай работы і фарміравання планаў пошукавых палявых работ на наступны год.

— Ужо на сёння па выніках архіўна-даследчых работ, праведзеных у рэгіёнах, мясцовыя органы ўлады, грамадскія арганізацыі, грамадзяне падалі 113 заявак на наступны год. Усе яны прыняты ў распрацоўку, вывучаюцца архіўныя дакументы, карты, аэрафотаздымкі, і мы будзем фарміраваць пошукавы план, — паведаміў прадстаўнік Узброеных Сіл.

Налета Беларусь адзначыць 80-годдзе вызвалення ад фашысцкіх захопнікаў, а ў 2025-м — 80-годдзе Вялікай Перамогі. Ваеннае ведамства падрыхтавала праект Указа Прэзідэнта аб зацвярджэнні складу рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і святкаванні гэтых знамянальных дат. Вызначаны праект плана мерапрыемстваў. Апрача іншага, разглядаецца пытанне ўручэння некаторым населеным пунктам вымпела «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Адпаведны праект указа ўжо накіраваны ва ўрад.

Флагман — Брэсцкая вобласць

Сумесна з Брэсцкай вобласцю ідзе работа па стварэнні Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці. Падрыхтаваны дакументы аб прысваенні гэтаму аб'екту статусу маладзёжнай будоўлі. Сумесна з Брэсцкім аблвыканкамам арганізаваны дабрачынны рахунак для акумулявання сродкаў ад грамадскасці і спонсараў, якія будуць накіраваны на стварэнне гэтага цэнтра. На яго будаўніцтва пойдуць і 50 % сродкаў, выручаных сёлета на рэспубліканскім суботніку.

Увогуле Брэсцкую вобласць можна лічыць флагманам па рабоце ў захаванні і ўвекавечанні памяці аб подзвігу беларускага народа ў гады ВАВ. Адзін з актуальных напрамкаў — алічбаванне помнікаў і ўстанаўленне побач з імі таблічак з QR-кодамі, па якіх можна знайсці сапраўдную абноўленую інфармацыю. Як расказаў **першы сакратар Брэсцкага абласнога камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Юрый СЕГЯНЮК,** на сёння алічбавана каля 200 помнікаў, памятныя таблічкі «Лічбавая зорка» ўстаноўлены на сотні помнікаў у рэгіёне.

Першым такім памятным месцам была, безумоўна, Брэсцкая крэпасць. А сёння сярод адметных мясцін ёсць і такія незвычайныя, як музей выратаваных помнікаў з тэрыторыі заходніх краін, які стварыў прыватны бізнес у пасёлку Мухавец Брэсцкага раёна. Літаральна нядаўна алічбаваны магілы дзесяці Герояў Савецкага Саюза, пахаваных побач з Брэсцкай крэпасцю на Гарнізонных могілках. Акрамя таго, распрацаваны адмысловы маршрут для наведвальнікаў, які дапамагае знайсці магілы і ўшанаваць памяць герояў.

Энцыклапедыя партызанскага руху

Сярод маштабных праектаў у інтэрнэт-прасторы і партал «Партызаны Беларусі», які без перабольшання можна назваць своеасаблівай энцыклапедыяй партызанскага руху. Партал штодзень напаўняецца інфармацыяй, а дакументы аб партызанскім руху на тэрыторыі Беларусі яшчэ доўга будуць папаўняць архівы, расказаў **загадчык аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Беларусі, кандыдат гістарычных навук Святаслаў КУЛІНОК.**

Як адзначыў гісторык, аб'ём архіўных дакументаў па гісторыі партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ўнікальны для ўсёй Усходняй Еўропы. У гады ВАВ кіруючымі органамі партызанскага руху, штабамі партызанскага руху — Беларускім і Цэнтральным — практычна з першых дзён стварэння вялася работа па захаванні дакументаў у партызанскіх атрадах і брыгадах. З пачатку 1943 года ў партызанскія атрады і брыгады ішлі шыфраграмы-ўказанні аб захаванні дакументаў па баявой дзейнасці партызанаў.

Пры гэтым адзначалася, што тое неабходна «для захавання гістарычнай памяці».

— Гэта значыць, ужо ў гады вайны кіраўнікі партызанскага руху ўсведамлялі і разумелі ўсю важнасць захавання дакументальнай спадчыны для далейшага яе вывучэння, асэнсавання і мемарыялізацыі гэтых падзей, — адзначыў Святаслаў Кулінок.

Акрамя таго, штабамі партызанскага руху была выбудавана дакладная сістэма дакументаабароту і справаводства. Гэта фактычна ўніфікаваная сістэма, якая дазволіла сфарміраваць разнастайныя відавы і інфармацыйны комплекс партызанскіх дакументаў. У выніку ўнутранага справаводства партызанскіх фарміраванняў, дакументаабароту паміж атрадамі і цэнтральнымі кіруючымі органамі партызанскага руху захаваўся значны комплекс такіх дакументаў. Сёння ён адкрыты для даследчыкаў. Тыя дакументы і сталі падставай для стварэння ўнікальнага партала.

Алена КРАВЕЦ.

Будзь у курсе!

Стаць студэнтам яшчэ не позна...

...шэраг ВНУ абвясціў дадатковы набор

Гэтымі днямі ў беларускіх ВНУ завяршаюцца ўступныя іспыты. А на спецыяльнасцях, дзе здача ўнутраных экзаменаў не прадугледжана, адбываецца залічэнне на бюджэтную форму навучання. На месцы, што засталіся вакантнымі пасля залічэння прэтэндэнтаў на студэнцкі білет, абвешчаны дадатковы набор.

Напрыклад, **Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт** чакае абітурыентаў на сямі спецыяльнасцях дзённай бюджэтнай формы атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту: гэта «Тэхналогія шкла, керамікі і вяжучых матэрыялаў» (26 вакантных месцаў), «Электрахімічныя вытворчасці» (13 месцаў), «Вытворчасць матэрыялаў і ўстройстваў электронікі (18 месцаў), «Прамысловыя і камунальныя сістэмы водападрыхтоўкі і водаачысткі» (15 месцаў), «Прынттэхналогіі (14 месцаў), «Тэхналогія дрэваапрацоўчых вытворчасцяў (16 месцаў), «Мехатронныя сістэмы і абсталяванне дрэваапрацоўчых вытворчасцяў» (3 месцы).

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій аб'явіў дадатковы набор на бюджэтныя месцы па чатырох спецыяльнасцях. Гаворка ідзе аб «Тэхналагічным абсталяванні галіны» (17 месцаў), «Прыродаахоўнай дзейнасці» (9 месцаў), «Абсталяванні вакуумнай кампрэсарнай і нізкатэмпературнай тэхнікі» (6 месцаў), «Таваразнаўстве» (3 месцы).

Падаць дакументы ўсё яшчэ можна на тры спецыяльнасці ў **Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка**. Гэта «Фізіка-матэматычная адукацыя (матэматыка і інфарматыка)» — 12 свабодных месцаў, «Фізіка-матэматычная адукацыя (фізіка і інфарматыка)» — два свабодныя месцы, «Фізіка-матэматычная адукацыя (матэматыка і фізіка)» — дзевяць свабодных месцаў.

У **Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Івана Шамякіна** чакаюць абітурыентаў на наступных спецыяльнасцях: «Інжынерна-педагагічная дзейнасць» (прафілізацыя: будаўніцтва з прысваеннем кваліфікацыі «Інжынер. Педагог» (6 вакантных месцаў), «Фізіка-матэматычная адукацыя (матэматыка і інфарматыка) з прысваенням кваліфікацыі «Выкладчык» — 11 месцаў, «Сучасныя замежныя мовы (англійская, нямецкая) з кваліфікацыяй «Лінгвіст. Выкладчык» — 11 месцаў, «Біялогія» з кваліфікацыяй «Біёлаг. Выкладчык» — 14 месцаў, «Прыродазнаўчая адукацыя (біялогія і хімія) з кваліфікацыяй «Выкладчык» (20 месцаў), «Дашкольная адукацыя» з кваліфікацыяй «Педагог» — 14 месцаў. Такім чынам вакантнымі ў Мазырскім педуніверсітэце застаюцца 76 месцаў.

У **Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту** падоўжаны прыём на вочную (дзённую) форму атрымання адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту па такіх спецыяльнасцях, як «Рухомы састаў чыгуначнага транспарту» («Праектаванне, выраб і эксплуатацыя вагонаў», «Цеплавозы», «Электрычны транспарт і метрапалітэн») — 13 месцаў, «Сістэмы забеспячэння руху цягнікоў» («Аўтаматыка і тэлемеханіка») — 20 месцаў, «Рухомы састаў чыгуначнага транспарту (Цеплавозы)» — 12 месцаў, «Рухомы састаў чыгуначнага транспарту» («Электрычны транспарт і метрапалітэн») — 10 месцаў і іншыя.

Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія аб'явіла дадатковы набор на спецыяльнасці «Вытворчасць прадукцыі жывёльнага паходжання», «Вытворчасць прадукцыі расліннага паходжання», «Ахова раслін і каранцін», «Тэхнічнае забеспячэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі».

Пра наяўнасць месцаў, якія не запоўніліся абітурыентамі, Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь, Універсітэт грамадзянскай абароны МНС, Інстытут пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь і ваенныя факультэты павінны праінфармаваць на сваіх сайтах да 1 жніўня. Усе іншыя ВНУ — да 5 жніўня. У большасць ВНУ падаць дакументы ў рамках дадатковага набору можна да 6 жніўня.

Таксама ў ВНУ працягваецца прыём дакументаў ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ. Дакументы будуць прымацца ў Акадэмію МУС, Магілёўскі інстытут МУС, Універсітэт грамадзянскай абароны МНС да 3 жніўня; на дзённую форму навучання па сельскагаспадарчых спецыяльнасцях — да 10 жніўня; у іншых ВНУ — да 9 жніўня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Інавацыі

Трансплантацыя: новы падыход

Вучоныя БДУ працуюць над павышэннем сумяшчальнасці органаў пры трансплантацыі

Як растлумачылі ў прэс-службе ўніверсітэта, гаворка ідзе аб магчымасці зрабіць у будучыні любы орган чалавека прыдатным для трансплантацыі незалежна ад сумяшчальнасці па групах крыві донара і рэцыпіента і ў перспектыве выйсці на альтэрнатыўную методыку перасадкі органаў.

Сёння трансплантацыя дазваляе выратаваць тысячы жыццяў. Аднак да гэтага часу істотным бар'ерам застаецца праблема несумяшчальнасці донарскіх кампанентаў і іх непрыняцце арганізмам з-за розных груп крыві ў донара і рэцыпіента. Яны адрозніваюцца структурамі, размешчанымі на паверхні эрытрацытаў і іншых клетак арганізма — антыгенамі. Калі антыгены донара адрозніваюцца ад антыгенаў рэцыпіента, то іммунная сістэмай яны будуць успрынятыя як чужародныя. Тады ў арганізме чалавека, якому трансплантавалі донарскі орган, пачнуць выпрацоўвацца антыцелы, якія атакуюць «чужых агентаў», што прывядзе да яго непрыняцця. У такім выпадку пераліванне крыві і трансплантацыя становяцца немагчымымі.

З клінічнага пункту гледжання важнай з'яўляецца змена антыгенаў А, В. Яны значна адрозніваюцца сваімі вугляводнымі астаткамі, на якія арганізм чалавека актыўна выпрацоўвае антыцелы. Універсальным з'яўляецца Н-антыген. Ён адпавядае групе крыві О, і на яго антыцелы не дзейнічаюць. Задача вучоных БДУ заключаецца ў выдаленні вугляводнага астатку ў антыгенах А, В і наданні ім універсальных уласцівасцяў Н(О)-антыгена. Гэта значна павысіць сумяшчальнасць такой крыві і органаў і дасць магчымасць трансплантаваць іх у арганізм любога чалавека.

Навукоўцы БДУ прапануюць змяняць антыгены крыві, выкарыстоўваючы спецыяльныя ферменты. Дадзены падыход сёння актыўна развіваецца дзякуючы навукоўцам з Універсітэта Брытанскай Калумбіі (Канада), якія правялі даследаванне і выявілі новыя высокаэфектыўныя ферменты ў мікраарганізмаў, што насяляюць кішэчнік чалавека. Навукоўцы БДУ высока ацанілі перспектыўнасць дадзенай ідэі і ў лабараторных умовах ужо таксама атрымалі патрэбныя ферменты для змены антыгенаў. Цяпер яны тэсціруюцца.

На першай стадыі праекта даследчыкі Белдзяржуніверсітэта сканцэнтравалі ўвагу на двухэтапным пераўтварэнні А-антыгена ў Н(О)-антыген. Адзін з пары ферментаў ужо атрыманы і ачышчаны. Вядзецца работа па атрыманні і ачыстцы другога. Пасля спецыялісты праверваць эфектыўнасць работы саміх ферментаў.

Пры спраўджанні навуковага эксперыменту вучоныя БДУ змогуць выйсці на альтэрнатыўную методыку трансплантацыі. Сёння ў медыцыне пры перасадцы органаў для прадухілення непрыняцця праводзяць наўмыснае аслабленне мясцовага імунітэту рэцыпіента. А новая методыка дазволіць гэтага пазбегнуць за кошт выдалення неўніверсальных антыгенаў з донарскага органа перад трансплантацыяй.

Над навуковым праектам працуе калектыў Навукова-даследчай лабараторыі біятэхналогіі кафедры мікрабіялогіі біялагічнага факультэта БДУ ў складзе загадчыка Максіма Патаповіча, прафесара Уладзіміра Пракулевіча, малодшага навуковага супрацоўніка Вольгі Коневай і іншых. У праекце задзейнічаны таксама загадчык аддзела перспектыўных напрамкаў высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Дзмітрый Крачак.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Працоўнае лета

ШКОЛА Ў ГРОДНЕ СТАЛА МАЛАДЗЁЖНАЙ БУДОЎЛЯЙ

На маштабным аб'екце працуюць два студэнцкія атрады

Адкрыццё школы ў новым мікрараёне Грандзічы-3 абласнога цэнтра павінна адбыцца напярэдадні новага навучальнага года. Будаўніцтва вядзецца з 2021-га. Чатырохпавярховая школа разлічаная больш як на тысячу месцаў, у дзве змены тут будзе займацца каля дзвюх тысяч вучняў. Прадугледжаныя два басейны, вялікія спартыўныя і трэнажорныя залы. Школа павінна задаволіць патрэбы маладога мікрараёна ў навучальнай установе, якой тут пакуль няма.

Штогод атрады працуюць на маладзёжных будоўлях. Летась, напрыклад, такім аб'ектам было будаўніцтва анкадыспансера, раней — работы па рэканструкцыі Кургана Славы. Сёлета рашэннем Гродзенскага аблвыканкама такой маладзёжнай будоўляй стала школа. Тут працуюць два студэнцкія атрады, якія носяць імёны Герояў Савецкага Саюза Мікалая Мультана і Уладзіміра Царука. Удзельнікі студатрадаў — студэнты Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, якія ў будучым атрымаюць будаўнічыя прафесіі.

Намеснік камандзіра атрада Мацвей ПАЦКАЛЕВІЧ вучыцца на інжынерна-будаўнічым факультэце.

— Для мяне вельмі важна набыць вопыт работы ў сваёй галіне, адчуць будоўлю з самага яе пачатку. Таксама ёсць магчымасць не марнаваць час летам, а нешта зарабіць. Нас працуе дзве брыгады, работы самыя разнастайныя, цяпер прыбіваем дошкі да падлогі. Вядома, многаму вучымся ў больш вопытных будаўнікоў. Лічу, што гэтыя навыкі дапамогуць у будучым, таму што мы бачым увесь праект, як ён увасабляецца ў рэальнасць, — расказаў Мацвей.

Яго сябар і аднакурснік Кірыл Сырыцкі таксама надае важнае значэнне такому вопыту, магчымасці прымяніць тэарэтычныя веды на практыцы. Абодва студэнты ганарацца тым, што ім давялося працаваць на аб'екце маладзёжнай будоўлі. Вядома, ёсць і магчымасць зарабіць. Напрыклад, Кірыл мяркуе патраціць зароблены грошы на вучобу ў аўташколе для атрымання катэгорыі А для ваджэння матацыкла. У планах — набыць і сам матацыкл.

— Работа ў студатрадах у самым разгары, і на сённяшні дзень больш за 3,5 тысячы маладых людзей з нашага рэгіёна працуе ў складзе студэнцкіх атрадаў, — паведаміў **першы сакратар Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ Андрэй ЕСІН**. — У цэлым на год у вобласці сфарміравана 7,5 тысячы працоўных месцаў. Нашы атрады працуюць не толькі ў Гродне і Гродзенскай вобласці, але і па ўсёй краіне. Задзейнічаныя гродзенцы на рэспубліканскім праекце на прадпрыемствах «Атлант», «МАЗ». Многія атрымалі напярэдадні работы спецыяльнасць «слесар механазборачных работ». Нашы студэнты прыступілі да медыцынскага праекта ў Наваполацку. Таксама студатрады працуюць за межамі Беларусі. Нядаўна завяршылася вахта гродзенцаў ва Усерасійскім цэнтры «Арлянё» і летніку «Марская хваля». У хуткім часе адправіцца ў Кемераўскую вобласць Расійскай Федэрацыі яшчэ адзін медыцынскі атрад. Студэнты працавалі там летась і вельмі добра сябе зарэкамендавалі.

Па словах лідара БРСМ, студатрадаўскі рух не збаўляе абароты, хоць сёлета яму спаўняецца 60 гадоў. Напрыклад, першага жніўня адзначаецца Дзень беларускіх студэнцкіх атрадаў. Гродзенцы плануюць правесці фестываль студэнцкіх атрадаў на Аўгустоўскім канале, які, дарэчы, больш за 20 гадоў таму быў аб'яўлены першай у Беларусі маладзёжнай будоўляй.

Чарговая маладзёжная будоўля — таксама вельмі значны аб'ект. Школу ў мікрараёне Грандзічы чакаюць другі год. Пакуль такой навучальнай установы тут няма, раён жа пастаянна будуецца, расце. Як паведамілі на будоўлі, работы падыходзяць да заканчэння, вядзецца ўнутранае адстройванне.

Школа мае адпавядаць усім сучасным патрабаванням. Тут будзе арганізавана безбар'ернае асяроддзе, пакладзена тактыльная плітка, абсталяваны пад'ёмнікі, пандусы, а таксама ліфт. Установа павінна стаць сацыяльна-культурным цэнтрам мікрараёна, дзе дзеці і дарослыя змогуць наведваць спартыўныя пляцоўкі, футбольнае поле, басейн.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

Ні кроку без анекдота

«Каласкі» і «Калінкі» — галоўныя завадатары айчыннага жартоўнага руху — прывіталі найлепшых гумарыстаў з рэгіёнаў краіны на Рэспубліканскім фестывалі народнага гумару «Аўцюкі-2023» у Калінкавіцкім раёне.

Па традыцыі быў адкрыты сімвал свята. У гонар сёлетняга, 11-га, фэсту на фестывальнай алеі вырасла 11-пялёсткавая кветка з металу. Цяпер гэта чарговая вясковая славутасць. У напамін пра фестывалі ў розныя гады засталіся — «Лава прымірэння», якая дапамагла вырашыць спрэчныя пытанні паміж жыхарамі Вялікіх і Малых Аўцюкоў. У год юбілейнага 10-га свята тут з'явіўся аўцюкоўскі «Экскалібур» — піла, якая намертва захрасла ў камені, — напамін, што самая неверагодная справа пад сілу, калі ўзяцца за яе гуртам. Сёлетні сімвал, па словах аўцюкоўцаў, выконвае жаданні ўсіх гасцей іх Краіны гумару. Так мясцовыя жыхары называюць свае самабытныя населеныя пункты — Вялікія і Малыя Аўцюкі, Сырод.

Дарэчы, старшыні Малааўцюкоўскага, Вялікааўцюкоўскага і Сыродскага сельсаветаў вельмі арыгінальна правялі цырымонію адкрыцця сімвала свята. Яны пераўвасобіліся ва ўдзельнікаў гумарыстычнага інструментальнага ансамбля.

— Рыхтуюцца да фестывалю не толькі тутэйшыя. Вяртаюцца на свята і былыя нашы жыхары. Яны ведаюць, што гэта нацыянальны здабытак аўцюкоўцаў. Была сустрэча і напярэдадні. Сабралася каля двухсот чалавек. Гэта людзі, якія, як у нас кажуць, вяртаюцца туды, дзе бацькава пупавіна зарыта ў двары. Фестываль — асаблівая, жаданая падзея ўвогуле для ўсіх у нашым раёне. Найцікавейшыя падворкі рыхтавалі ўсе 18 сельсаветаў, — з гонарам за сябе і калег распавёў **старшыня Малааўцюкоўскага сельвыканкама Міхаіл ДУЛУБ.**

Аўцюкі — асобная нацыя са сваёй мовай і філасофіяй, пераконваюць мясцовыя жыхары. Яна не здрадзілі на свяце сваёй любімай традыцыі — правядзенню «мытнага кантролю». Каб трапіць у іх Краіну гумару, неабходна замест пашпарта «прад'явіць» жарт, анекдот ці прыпеўку.

Разам са спецыяліскай «мытнага кантролю» гасцей сустракала аўцюкоўскі «страхавы агент».

— Страхуем усё! Добры настрой, шклянкі, бляшанкі, трактары і нават нафту, — пералічыла спецыяліст «Аўцюкстраха» і падзялілася сакрэтам, як на свяце, паміраючы са смеху, падоўжыць жыццё.

Пасля праходжання «мытнага кантролю» і «страхавання» госці маглі завітаць на гумарыстычныя падворкі.

— Эх, лапці мае, абцасы ўсе сцерла. Каб не пела, не скакала, то б даўно памерла, — сыпалі прыпеўкамі гаспадары аднаго з падворкаў па матывах кінастужкі «Вяселле ў Малінаўцы». Так, у каларытныя вобразы прыбраліся педагогі Калінкавіцкай сярэдняй школы № 7.

— Усё натуральнае, ніякага сілікону, — паведамілі гаспадыні аб тым, як уважліва падышлі да прапрацоўкі вонкавага выгляду сваіх персанажаў.

— У нашай праграме ўсё, як у краме. Як становішся ў чаргу, — падымаеш нагу, — завітаць на незвычайны спартыўны падворак запрасілі «аўцюкоўскія трэнершы», а ў рэальным жыцці педагогі Калінкавіцкай сярэдняй школы № 1.

— Нашы палескія жарты ні з чым не параўнаць, а яшчэ тут асаблівыя людзі, пазітыўны

запал. Колькі пражыла, нідзе такіх жартаў больш не чула. Ганаруся нашай зямлёй, нашай краінай, — падзялілася Надзея з Гродзеншчыны — юрыстка і аматарка здаровага гумару, як сама прадставілася госця свята.

Афіцыйную частку фестывалю адкрылі парад-шэсце з песнямі і прывітанне творчых дэлегацый. З галоўнай святочнай сцэны ўрачыста адкрылі Рэспубліканскі фестываль народнага гумару «Аўцюкі-2023» **намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый АЛЕЙНІКАЎ** і **старшыня Калінкавіцкага райвыканкама Сяргей ГВОЗДЗЬ.**

Кіраўнік раёна падзякаваў аблвыканкаму і Міністэрству культуры Беларусі за ўвагу і падтрымку свята на калінкавіцкай зямлі.

— Смех — гэта дар Божы. Тут усе імкнуцца весяліцца, каб жадалася жыць і стварацца. Гэта наша народная мудрасць, — усіх, хто любіць гаючае вострае слова, на цырымоніі адкрыцця фестывалю гумару прывітаў старшыня Калінкавіцкага райвыканкама Сяргей Гвоздзь.

— Гэта самы пазітыўны форум краіны. Ён дае магчымасць усім жадаючым ацаніць народны гумар. Гэта фестываль вынаходлівасці, жыццялюбства беларускага народа. Унікальнасць аўцюкоўцаў у тым, што яны заахвочваюць вялікую колькасць удзельнікаў фестывалю. На самай справе пасмяяцца з сябе могуць толькі моцныя духам людзі, таленавітыя і ў працы, і ў адпачынку, — падкрэсліў намеснік старшыні аблвыканкама Дзмітрый Алейнікаў.

Сёлета ў конкурснай праграме фестывалю ва ўменні дасціпна жартаваць спрачаліся творчыя дэлегацыі з усіх абласцей Беларусі. Па традыцыі была заяўлена агульная злабадзённая тэма, якую праз жарты і імпрэзы раскрывалі шэсць калектываў. За аснову яны ўзялі спорт і гумар альтэрнатыву Алімпійскім гульням. Таму кожнае выступленне прадстаўнікоў абласцей суправаджалася спартыўнай візітоўкай.

— Для мяне гонар быць тут. Шчыры дзякуй гасцям, усім людзям, якія прыязджаюць кожны раз на фестываль, — падзякаваў **старшыня журы фестывалю «Аўцюкі-2023», мастацкі кіраўнік тэатра народнага гумару і песні «Радзівілаў тэатр» Уладзімір РАДЗІВІЛАЎ.**

На высокую канкурэнтаздольнасць і рост узроўню арганізацыі свята звярнула ўвагу і член журы фестывалю, **начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Беларусі Ірына КАРПОВІЧ.**

— На інфармацыйным полі сёння беларускім фестывалям нават прыходзіцца змагацца за ўвагу, таму што ў адзін і той жа час праходзяць святы ў розных кутках краіны. Так што ідзе добрая канкурэнцыя за тое, каб прыцягнуць больш наведвальнікаў, быць у інфармацыйным полі і ў рэйтынгу фестываляў краіны вышэй, лепш, ярчэй. Гэта садзейнічае развіццю, — адзначыла член журы.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.

Добрая навіна

Новая жамчужына сталіцы

Мінчане атрымалі выдатны падарунак

Сотні чалавек з усіх рэгіёнаў краіны сабраліся на заходнім беразе Цнянскага вадасховішча ў мінулую суботу. Там адбылося ўрачыстае адкрыццё новага Lakeside-парку. Сярод ганаровых гасцей — старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір Кухараў, кіраўнік інвестыцыйнай кампаніі спадар Махамед Алабар. Карэспандэнт «Звязды» таксама прагуляўся па парку, асабісты вердыкт — атрымалася прыгожа, якасна, з душой.



У дзень адкрыцця лакацыі для мінчан і гасцей горада падрыхтавалі вялікую забаўляльную праграму. Людзей было шмат. Многія прыходзілі з дзецьмі. Хтосьці адпачываў на пляжы, хтосьці абыходзіў фотазоны, а большая частка гасцей вырашыла прайсці квэст і, набраўшы патрэбную колькасць балаў, атрымаць прыгожы падарунак — беласнежнага мядзведзя. На сцэне публіку забаўляў вядучы, на фуд-зоне пахла шашлыкамі, а дзіцячая пляцоўка са шматлікім гульнявым абсталяваннем стала цэнтрам прыцягнення юных гасцей. Таксама можна было паглядзець выступленні кавер-бэндаў і святочны феерверк каля вады, які расфарбаў неба ў 22.30.

— Вельмі прыемна, што сёння мы прысутнічаем на сапраўды добрай падзеі — адкрыцці новага парку, які, вядома ж, стане ўпрыгажэннем гэтай тэрыторыі, — сказаў падчас урачыстага адкрыцця **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ**, — Тут вельмі прыгожая прырода, якая патрабавала прыкласці руку для таго, каб стварыць добрыя ўмовы для адпачынку як дарослых, так і дзяцей. І, вядома, людзі атрымаюць шмат задавальнення, таму што тут усё створана для чалавека. Для горада важна, калі будуюцца паркі, таму што горад — гэта заўсёды шмат машын, дамоў і асфальту. Але кожнаму чалавеку хочацца пабыць каля вады, сярод зеляніны, на прыродзе. І я ўпэўнены, што гэты парк стане яшчэ адным зялёным упрыгажэннем, жамчужынай нашай сталіцы.

Мэр горада нагадаў, што Махамед Алабар з'яўляецца інвестарам вельмі сур'ёзнага і значнага праекта для горада Мінска.

— Спадар Алабар — гэта чалавек, які думае пра будучыню, — адзначыў мэр. — Хацелася б падзякаваць яму за тое, што рэалізацыю інвестпраекта ён пачаў з будаўніцтва вось такога выдатнага парку. Ужо ідзе будаўніцтва выставачнага цэнтра, іншых аб'ектаў, жылля, якія будуць прывабныя для нашай краіны. Я рады, што ў горадзе з'явіўся такі цікавы аб'ект. Пры яго будаўніцтве выкарыстоўваліся самыя сучасныя тэхналогіі і адначасова творчы падыход. Многія беларускія скульптары змаглі рэалізаваць свае ідэі, якія мы тут бачым. Атрымаўся ўдалы сімбіёз творчых ідэй і іх рэалізацыя.

Бізнесмен прызнаўся, што яму прыемна бачыць эмацыянальную рэакцыю людзей у гэты дзень.

— Парк пабудаваны для вас, вашых дзяцей, — звярнуўся да публікі **кіраўнік інвестыцыйнай кампаніі спадар Махамед АЛАБАР**. — Гэтая зона адпачынку новая, яна будзе развівацца. Вы не будзеце тут сумаваць.

Інвестар займаецца бізнесам 35 гадоў у больш чым 50 краінах.

— Асаблівую ўвагу ў рабоце аддаю якасці жыцця людзей, навакольнай прасторы. Таму ў гэтым парку мы пастараліся стварыць максімальна камфортнае асяроддзе для вас. Хачу падзякаваць мэру горада і вашаму Прэзідэнту за падтрымку праекта, — падкрэсліў спадар Алабар.

Галоўная адметнасць парку — 17 скульптур, гэта работы беларускіх майстроў. Над кожнай працавалі вельмі доўга і карпатліва.

Lakeside арганічна спалучае прыгажосць прыроды, мастацтва і дасягненні сучаснасці. Для заняткаў спортам тут прадугледжаны спецыяльныя пляцоўкі, бегавыя і веладарожкі. Аматараў спакойнага адпачынку пацешаць уладкаваныя набярэжная і пляж. Ёсць тут і пірс для рыбалкі, і амфітэатр. Словам, усё, што трэба для добрага баўлення часу.

— У парку створаны ўсе ўмовы для адпачынку. Можна смачна паесці, пазаймацца спортам. Жыву недалёка, таму буду тут бываць часта, — падзяліўся мінчанін Мікалай.

— Вельмі крутая інфраструктура! Жывая, зялёная, усё на вышэйшым узроўні! Галоўнае, што маім дзецям падабаецца, — адзначыла Крысціна.

— Цудоўны пляж, пабольш бы такіх... Добрае месца для прагулкі, бегу. Найлепшае месца, каб правесці дзень на адкрытым паветры з сям'ёй, — лічыць Іван.

Мяркуючы па колькасці наведвальнікаў, якія прыйшлі на адкрыццё новай зоны адпачынку, можна лічыць, што парк ужо папулярны, а свята атрымалася.

Як вядома, у паўночнай частцы сталіцы будуецца шматфункцыянальны комплекс «Паўночны бераг», які плануюць цалкам уладкаваць да 2040 года. Ён разгорнецца на шасці мільёнах квадратных метраў. Тут пабудуюць жылыя дамы з усёй неабходнай інжынернай і транспартнай інфраструктурай, выставачны цэнтр і сацыяльныя аб'екты. Пакуль тэрыторыю Цнянкі змяніў толькі атмасферны парк, але побач ужо відаць абрысы шматпавярховікаў.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,
фота аўтара.

Надвор'е

Месцамі моцныя дажджы, а вецер парывісты

Часам сур'ёзныя ліўні і нават град

Надвор'е ў Беларусі будзе мець няўстойлівы характар, прагназуюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У першы дзень жніўня ўмовы надвор'я будуць фарміраваць няўстойлівыя паветраныя масы, днём на паўночным захадзе адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту. Чакаецца пераменная воблачнасць. Ноччу месцамі, а днём па Гродзенскай і Віцебскай абласцях на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах краіны прагрымяць навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі па краіне будзе згушчацца туман. Вецер паўднёвы, ўначы — паўднёва-заходні слабы, днём — умераны, пры навальніцах парывісты, у дзённыя гадзіны месцамі па захадзе моцны парывісты.

Мінімальная тэмпература паветра ў аўторак складзе ноччу ад 12 да 17 градусаў, а максімальная днём будзе ад 22 градусаў да 28 цяпла. Атмасферны ціск уначы істотна не зменіцца, а днём будзе падаць.

У сераду наша краіна акажацца пад уплывам сістэмы актыўных атмасферных франтоў, якія ссоўваюцца з боку Карпат. Чакаецца воблачна з праясненнямі. Уначы пераважна па заходняй частцы краіны, удзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі яны будуць моцныя, прагрымяць навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах краіны будзе згушчацца слабы туман. Вецер паўднёвы, днём з пераходам на заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты, днём у асобных раёнах краіны — моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ўначы будзе ад 13 да 19 градусаў, а максімальная днём — ад 19 да 25 цяпла, па ўсходзе краіны паветра прагрэецца да 28 градусаў.

У чацвер Беларусь будзе знаходзіцца пад уплывам малаактыўных франтальных раздзелаў, а ў дзённы час чакаецца паступленне цёплых паветраных мас паўднёвага паходжання. Вось і прыйдзе да нас жнівеньскае цяпло.

Прагназуецца пераменная воблачнасць. Месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах будзе згушчацца слабы туман. Вецер паўднёва-заходні, паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ноччу будзе знаходзіцца ў межах ад 11 да 17 градусаў, максімальная днём складзе 22—29 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 1 сентября 2023 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже имущества Петриковского производственного участка филиала ОАО «Рогачевский МКК» Калинковичского молочного комбината, расположенного по адресу: Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Коммунальная, д. 87, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Рогачевский молочноконсервный комбинат» на праве собственности

Лот № 1:
Объекты недвижимости

Здание цеха, одноэтажное, кирпичное, инв. № 335/С-6629, ул. Коммунальная, д. 87. Здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака. 1964 г. п., одноэтажное. Общая площадь 2125,7 кв. м. Составные части и принадлежности: шесть пристроек. **Здание компрессорной, одноэтажное, кирпичное**, инв. № 335/С-6634, ул. Коммунальная, д. 87. Здание неустановленного назначения. 1964 г. п., одноэтажное. Общая площадь 301,2 кв. м. Составные части и принадлежности: пристройка. **Здание конторы, одноэтажное, кирпичное, окрашенное**, инв. № 335/С-6631, ул. Коммунальная, д. 87. Здание административно-хозяйственное. 1964, 1985 гг. п., одноэтажное. Общая площадь 347,2 кв. м. Составные части и принадлежности: терраса. **Здание котельной, одноэтажное, кирпичное**, инв. № 335/С-6633, ул. Коммунальная, д. 87. Здание неустановленного назначения. 1964 г. п., одноэтажное. Общая площадь 380,2 кв. м. Составные части и принадлежности: две пристройки. **Здание мазутонасосной, одноэтажное, кирпично-металлическое**, инв. № 335/С-6632, ул. Коммунальная, д. 87. Здание неустановленного назначения. 1970 г. п., одноэтажное. Общая площадь 48,8 кв. м. **Проходная**, инв. № 335/С-102936, ул. Коммунальная, 87/1. Здание административно-хозяйственное. 1964 г. п., одноэтажное. Общая площадь 9,5 кв. м. **Здание КНС, одноэтажное, кирпичное**, инв. № 335/С-6630, ул. Коммунальная, д. 87. Здание неустановленного назначения. 1964 г. п., одноэтажное. Общая площадь 12,2 кв. м. **Трансформаторная подстанция**, инв. № 335/С-102897, ул. Коммунальная, 87/5. Сооружение специализированное энергетики. 1964 г. п., одноэтажное. Общая площадь 42,6 кв. м. **Автодороги внутризаводские**, инв. № 335/С-102899, ул. Коммунальная, 87 территория ПУП «Калинковичский молочный комбинат». Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства. 1981 г. п. Протяженность 5449,5 м. **Отстойник,** инв. № 335/С-102919, Петриковский с/с, северное г. Петриков. Сооружение специализированное водохозяйственного назначения. 1964 г. п. Площадь 27 955,9 кв. м. **Отстойник 2-къярусный**, инв. № 335/С-102920, Петриковский с/с, северное г. Петриков. Сооружение специализированное водохозяйственного назначения. 1968 г. п. Площадь 40,0 кв. м. **Скважина артезианская**, инв. № 335/С-789634, ул. Коммунальная, 87/3. Сооружение специализированное водохозяйственного назначения. 1974 г. п. Общая площадь 20,3 кв. м. **Скважина артезианская**, инв. № 335/С-789638, ул. Коммунальная, 87/4. Сооружение специализированное водохозяйственного назначения. 1978 г. п. Общая площадь 19,7 кв. м. **Труба дымовая кирпичная**, инв. № 335/С-789632, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калинковичский молочный комбинат». Сооружение специализированное обрабатывающей промышленности. 1964 г. п. Площадь 11,0 кв. м. **Резервуар пожарный**, инв. № 335/С-789628, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калинковичский молочный комбинат». Сооружение специализированное водохозяйственного назначения. 1964 г. п. Объем 42,0 м куб. **Башня водонапорная**, инв. № 335/С-789629, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калинковичский молочный комбинат». Сооружение специализированное водохозяйственного назначения. 1964 г. п. Площадь 13,0 кв. м. **Забор кирпичный**, инв. № 335/С-102898, ул. Коммунальная, 87 территория ПУП «Калинковичский молочный комбинат». Сооружение неустановленного назначения. 1964 г. п. **Забор железобетонный**, инв. № 335/С-102917, ул. Коммунальная, 87 территория ПУП «Калинковичский молочный комбинат». Сооружение неустановленного назначения. 1993 г. п. Площадь 63,0 кв. м. **Забор железобетонный**, инв. № 335/С-102918, ул. Коммунальная, 87 территория ПУП «Калинковичский молочный комбинат». Сооружение неустановленного назначения. 1999 г. п. Площадь 1075,0 кв. м. **Навес с дезбарьером**, инв. № 335/С-102900, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калинковичский молочный комбинат». Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства. 2002 г. п. **Асфальтовая дорога к навесу с дезбарьером**, инв. № 335/С-102916, ул. Коммунальная, 87 территория ПУП «Калинковичский молочный комбинат». Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства. 2002 г. п. Площадь 187,0 кв. м. **Гараж**, инв. № 335/С-789639, ул. Коммунальная, 87/6. Здание специализированное автомобильного транспорта. 1994 г. п, одноэтажное. Общая площадь 208,0 кв. м. **Мойка транспорта**, инв. № 335/С-102896, ул. Коммунальная, 87/8. Здание специализированное транспорта. 1994 г. п., одноэтажное. Общая площадь 92,5 кв. м. **Склад ГСМ**, инв. № 335/С-789635, ул. Коммунальная, 87/7. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. 1994 г. п., одноэтажное. Общая площадь 31,1 кв. м. **Здание склада-ангара**, **одноэтажное, кирпично-металлическое с тремя нежилыми изолированными помещениями**, инв. № 335/С-6628, ул. Коммунальная, д. 87. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. 1987 г. п., одноэтажное. Общая площадь 523,5 кв. м. **Склад металлический**, 335/С-789637, ул. Коммунальная, 87/9. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. 1994 г. п., одноэтажное. Общая площадь 17,2 кв. м. **Труба дымовая металлическая**, инв. № 335/С-789633, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калиновичский молочный комбинат». Сооружение специализированное энергетики. 1994 г. п. Площадь 1,0 кв. м. **Емкость для хранения топлива**, инв. № 335/С-789630, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калиновичский молочный комбинат». Сооружение специализированное складов, хранилищ. 1994 г. п. Площадь 28,0 кв. м. **Емкость для хранения топлива**, инв. № 335/С-789631, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калиновичский молочный комбинат». Сооружение специализированное складов, хранилищ. 1994 г. п. Площадь 28,0 кв. м. **Склад металлический**, 335/С-789636, ул. Коммунальная, 87/10. Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. 1994 г. п., одноэтажное. Общая площадь 17,2 кв. м. **Кабель подземный**, инв. № 335/С-789601, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калиновичский молочный комбинат». Сооружение специализированное энергетики. 1963 г. п. **Тепловые сети**, инв. № 335/С-789602, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калиновичский молочный комбинат». Сооружение специализированное коммунального хозяйства. 1963 г. п. Протяженность 18,9 м. **Напорная канализация**, инв. № 335/С-70936, ул. Коммунальная, территория возле молочного комбината. Сооружение специализированное коммунального хозяйства. 2015 г. п. Протяженность 470,0 м. **Трубопровод из труб из полимерных материалов**, инв. № 335/С-789604, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калиновичский молочный комбинат». Сооружение специализированное трубопроводного транспорта. 2002 г. п. Протяженность 220,3 м. **Сеть канализационная**, инв. № 335/С-789603, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калиновичский молочный комбинат». Сооружение специализированное коммунального хозяйства. 1964 г. п. Протяженность 247,0 м. **Сеть водопроводная**, инв. № 335/С-789605, ул. Коммунальная, 87, территория ПУП «Калиновичский молочный комбинат». Сооружение специализированное водохозяйственного назначения. 1963 г. п. Протяженность 21,0 м.

Прочее имущество: резервуар В2-ОМГ-10 в кол-ве 5 ед. с №№ 1837, 1838, 1839, 1840, 1841; резервуар металлический вертикальный, 50 м куб., № 1845; трансформатор силовой, № 2065; агрегат ЭЦВ 8-16-40, № 5056; насос центробежный д/сточных вод в кол-ве 2 ед., №№ 3010, 3011; система видеонаблюдения общезаводская, № 5213; автоматическая система коммерческого учета электрической энергии, № 3424; механизм открывания ворот в кол-ве 2 ед., №№ 1740, 1741; объекты растительного мира, № 3164.

Начальная цена лота №1: 2 892 553,75 рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %).
Задаток: 29 000,00 рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %).

Земельный участок для размещения объектов недвижимого имущества: инв. № 335/С-6628, инв. № 335/С-6629, инв. № 335/С-6630, инв. № 335/С-6631, инв. № 335/С-6632, инв. № 335/С-6633, инв. № 335/С-6634, инв. № 335/С-102896, инв. № 335/С-102897, инв. № 335/С-102898, инв. № 335/С-102899, инв. № 335/С-102900, инв. № 335/С-102916, инв. № 335/С-102917, инв. № 335/С-102918, инв. № 335/С-102936, инв. № 335/С-789601, инв. № 335/С-789602, инв. № 335/С-789603, инв. № 335/С-789604, инв. № 335/С-789605, инв. № 335/С-789628, инв. № 335/С-789629, инв. № 335/С-789630, инв. № 335/С-789631, инв. № 335/С-789632, инв. № 335/С-789633, инв. № 335/С-789634, инв. № 335/С-789635, инв. № 335/С-789636, инв. № 335/С-789637, инв. № 335/С-789638, инв. № 335/С-789639, на праве постоянного пользования площадью 2,6614 га. с кадастровым номером 324350100003000681. **Земельный участок для содержания и обслуживания очистных сооружений (для размещения объектов коммунального хозяйства):** инв. № 335/С-70936, инв. № 335/С-102919, инв. № 335/С-102920, на праве постоянного пользования площадью 4,3024 га с кадастровым номером 32430000000001001620. Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 30.08.2023 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 9.00 до 10.00 **01.09.2023 г.** Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5 %.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 01.08.2023 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 0,8 % от окончательной цены продажи Объектов; в течение 5 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не будет достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объектов, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней после проведения аукциона

Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, т. +375 232 32-46-47; 32-18-95; +375 29 170-46-47; сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@gino.by
Продавец: филиал ОАО «Рогачевский МКК» Калинковичский молочный комбинат, Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Суркова, 10, тел.: +375 29 382-10-57, +375 234 5-83-08.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) проводит открытый аукцион по продаже

здания конторы с инв. № 630/С-47139

(составные части и принадлежности: бетонная площадка, противопожарный резервуар, сети водоснабжения, сети водоотведения, сети электроснабжения),

общей площадью 385,8 кв. м, адрес: Минская область, Молодечненский район, Тюрлевский с/с, д. Носилово, ул. Школьная, 30 (далее – Объект)

Объект расположен на земельных участках с кадастровым номером 623884308601000407 (право постоянного пользования) площадью 1,9100 га, 623884308601000758 (право постоянного пользования) площадью 0,0002 га, *который имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки, водоема – р. № 1, пл. 0,0002 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 23 808,00** бел. руб. *Начальная цена снижена на 60 %.* Задаток 10 % от начальной цены – **2 380,00** бел. руб.

Шаг аукциона: 5 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 06.12.2022, 10.05.2023, 14.06.2023.

Аукцион состоится **15.08.2023 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.08.2023** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.

УНП 600077220

Открытое акционерное общество

«Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»

